Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Са[illegible] Бе[illegible]рўсь

Орган Цэнтральнага В[illegible]нага Камітэту Саветаў БССР

10 год выданьня.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 187 (2676) Нядзеля, 18-га жніўня 1929 г.

Кошт нумару 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз. Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к.; „ 3 „ — 2 р. 70 к.; „ 6 „ — 4 р. — к.; „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародніх — 20 к., мясцовым — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нанпарэлі пасярод тэксту 1 р. — к. За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьлепешыя на 50 проц. даражэй. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт 35 кап. За кожны дадатковы 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт 15 „ За кожны дадатковы 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

[illegible]кая Беларусь" [illegible] 13. Госуд. адзін экз.

Савецкі ўрад здолее дабіцца сваіх правоў

Мінула больш месяца з часу захопу УК чыгункі гаміндана ўскаю ўладаю контр-рэвалюцыйнага Кітаю. Ужо можна падсумаваць некаторыя вынікі. Захоп чыгункі падрыхтоўваўся даўно. Кітайскія газэты і часопісі ўжо з красавіка зусім адкрыта пісалі аб надыходзячым захопе чыгункі. Міністр замежных спраў нанкінскага ўраду ўжо 6-га чэрвеня заявіў прадстаўнікам замежнага друку, што нацыянальны ўрад ўжыве захады рашучага характару ў адносінах да СССР.

Агенцтва Рэйтэра агаласіла 11-га чэрвеня афіцыйнае паведамленьне аб пасяджэньні ЦК Гаміндану; гэтае паведамленьне непасрэдна казала, што „лідэры нацыянальнага ўраду думаюць, што раней, чымся аднавіць дыплёматычныя зносіны з Масквою, Расея павінна даць згоду на дзьве ўмовы, а іменна: 1) зварот Усходня-Кітайскай чыгункі, 2) роспуск прафсаюзаў на Усходня-Кітайскай чыгунцы. Пляны нанкінскага ўраду былі вядомы імпэрыялістычным дзяржавам. Яны ведалі аб падрыхтоўцы Нанкінам і Мукдэнам авантуры. Яны ня толькі ня ўтрымалі Нанкін ад авантуры, але нават падбухторвалі яго.

Амэрыканскі міністр замежных спраў Стымсон выступае, як „міратворац", як „пасрэднік", прыцягваючы да гэтай справы Францыю і не прыцягваючы Японіі. Гэтым ён надкрэсьлівае, што Злучаныя Штаты ня прызнаюць „спэцыяльных інтарэсаў і правоў" Японіі ў Манчжурыі. Францыя падтрымлівае выступленьне Злучаных Штатаў, але адначасна яна выказвае і свае прэтэнзіі на чыгунку. У свой час было, што француская дыплёматыя заявіла пратэст супроць згоды між СССР і Кітаем наконт УК чыгункі, спасылаючыся на некія міфічныя правы Францыі на гэтую чыгунку.

Стымсон пасьля таго, як наш урад адхіліў яго прапанову аб пасрэдніцтве, ужо ў даволі выразнай форме прапануе інтэрнацыяналізацыю чыгункі, г. зн. перадачу УК чыгункі міжнароднаму канцэрну банкаў. Ужо зусім выразна стала, што справа ідзе зусім не аб тым, каб УК чыгунка перайшла ў рукі мукдэнскай ці нанкінскай групы: справа ідзе толькі аб тым, каб УК чыгунка перайшла ў рукі амэрыканскага, францускага капіталу, або абярнулася ва ўласнасьць міжнароднага канцэрну. Або аднаўленьне «статус-кво», вырашэньне пытаньня аб лёсе чыгункі з Савецкім Саюзам і Кітаем бяз удзелу трэціх дзяржаў, або пераход чыгункі да імпэрыялістаў. Іменна, так пастаўлена пытаньне.

Ня так даўно СССР падпісаў угавор з Кітаем, які зьнішчыў усе ранейшыя няроўныя ўгаворы, падпісаныя між царскай Расеяй і Кітаем, і ў якім СССР адмовіўся ад усіх канцэсій і прывілей у Кітаі, ад экстэрытарыяльнасьці, ад баксэрскай кантрыбуцыі, ад кантролю над мытніцаю і г. д. Гэты ўгавор аднавіў сувэрэнітэт Кітаю і так званай палясе адабраньня УК чыгункі і заснаваў супольнае кіраваньне чыгункаю. Нанкін і Мукдэн парушылі гэты ўгавор. СССР прытрымліваецца яго і тым самым абараняе правы і і інтарэсы кітайскага народу. Наш урад не дапусьціць, каб мукдэнскія або нанкінскія генэралы перадалі чыгунку імпэрыялістам.

Аднак, захоп УК чыгункі абвострыў толькі барацьбу між імпэрыялістамі за ўладу, і за ўплыў і эканамічныя пазіцыі ў Кітаі. Між Мукдэнам і Нанкінам таксама адбываецца барацьба не за УК чыгунку, а за тое, хто іменна —Мукдэн ці Нанкін—павінен атрымаць узнагароду за перадачу чыгункі імпэрыялістам. Гэты канфлікт між Нанкінам і Мукдэнам наглядна ілюструе наколькі „аб'яднан" Кітай, наколькі ажыцьцёўлены заветы Сун-Ят-Сэна.

Кітай гаміндана ўскай контр-рэвалюцыі не атрымаў ад імпэрыялістаў нават адмены экстэрытарыяльнасьці за тое, што, здрадзіўшы заветам уласнага правадыра і заснавацеля, стаў зброяй у руках імпэрыялізму супроць СССР. Шырокія масы кітайскага народу яшчэ раз наглядна пераканаліся, што СССР быў адзінаю краінаю, якая абвясьціла дабраахвотна ня толькі экстарытарыяльнасьць, але і зьнішчыла ўсе нераўнапраўныя ўгаворы. Не на іх, не на рабочых і сялян абапіраецца Нанкін у сваёй барацьбе супроць СССР. Ён абапіраецца на кампрадорскую буржуазею, на рэакцыйных абшарнікаў, на наёмнае войска і на расейскіх белагвардзейцаў.

Расейскія белагвардзейцы ў Кітаі— сьмецьце са сьмецьця нават контр-рэвалюцыйнай эміграцыі — зьяўляюцца найбольш актыўным элемэнтам у барацьбе Нанкіну і Мукдэну супроць СССР. Іменна за гэтым заява тав. Карахана падкрэсьлівае, што нанкінскі і мукдэнскі ўрады нясуць поўную адказнасьць і за ўчынкі белагвардзейскіх бандытаў на У-К чыгунцы. Палітыка нашага ўраду выразная і цьвёрдая. Рабочыя, сяляне, усе працоўныя масы нашае краіны, як адзін чалавек падтрымліваюць яе. Пралетарыят Кітаю ня раз дэманстраваў сваю салідарнасьць з СССР у часе крызысу.

Разрыў гандлёвых зносін, спыненьне закупак чаю, развал чыгункі і выкліканая ім раўналегласьць эканамічнага жыцьця ў паўночнай Манчжурыі, выкрыцьцё імпэрыялістычных плянаў наконт „інтэрнацыяналізацыі" У-К чыгункі ацьвярожвае нават некаторыя пласты кітайскай буржуазеі. А калі белагвардзейцы ці кітайскія генэралы адважацца яшчэ на якія-небудзь авантурныя ўчынкі, дык далёка-ўсходняя спэцыяльная армія пакажа ім, што нельга бяскарна пасягаць на савецкія межы. Савецкі ўрад здолее дабіцца сваіх правоў...

„Праўда".

АДОЗВА ЦК КП(б)Б

да ўсіх камуністаў, рабочых, батракоў, сялян-беднякоў і сераднякоў.

АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ ДНЮ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Таварышы!

Пастаўленая камуністычнай партыяй задача ў найбольш кароткі тэрмін дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах капіталістычныя краіны знайшло свой жывы і актыўны творчы водгук шматміліённых мас рабочых, батракоў, сялян-беднякоў і сераднякоў і ўсіх працоўных нашага Савецкага Саюзу і БССР. Рабочая кляса СССР і БССР пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, абапіраючыся на вясковую беднату і ў щчыльным саюзе з серадняком, пры падтрыманьні сусьветнага пралетарыяту з энтузыязмам, пераможна і шпаркім тэмпам працягвае будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне. Рабочыя, батракі і сяляне беднякі і серадкякі з усёй актыўнасьцю і рашучасьцю падтрымліваюць генэральную лінію партыі ў будаўніцтве сацыялізму, лінію на шпаркі тэмп індустрыялізацыі краіны, сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі. Шпаркі тэмп індустрыялізацыі нашай краіны і калектывізацыя сельскай гаспадаркі—гэта генэральны шлях будаўніцтва сацыялізму, гэта магутны рашучы адказ на імпэрыялістычныя выпады капіталістычных драпежнікаў, якія жадаюць крыві і пагібелі першай у сьвеце чырвонай рэспублікі працы.

На усесаюзны дзень індустрыялізацыі, які з энтузыязмам праведзены рабочай клясай, аднадушна адгукнулася бядняцка-серадняцкая вёска прапановай правесьці масавы дзень калектывізацыі вёскі. Батрак, селянін-бядняк і серадняк, не жадаючы адстаць у «вялікім пачыне» ад свайго кіраўніка і саюзьніка рабочае клясы прыступае да правядзеньня „дню калектывізацыі" і ўсе рабочыя, уся савецкая грамадзкасьць павінны прыйсьці на дапамогу і актыўна падтрымаць гэтае вельмі добрае пачынаньне і абярнуць яго ў сапраўдны масавы дзень калектывізацыі і гэтым самым нанесьці яшчэ і яшчэ рашучы ўдар па кулаку і пасунуць вёску наперад па сацыялістычнаму шляху.

Ва ўмовах Савецкай Беларусі, дзе сельская гаспадарка пераважна зьяўляецца дробнай, распыленай малатаварнай, дзе ў мінулым быў значны рост хутароў, масавая калектывізацыя бядняцка-серадняцкіх гаспадарак набывае асаблівае, выключна першачарговае значэньне. Трэба падняць шырокія бядняцка-серадняцкія масы вёскі на сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі пад лёзунгам „процi хутара і абрэзу. Процi дробнага пасёлку. За буйныя калгасы, калгасы, якія ахапляюць цэлыя сёлы і раёны".

Вясковыя камуністы, як у „дзень калектывізацыі", так і ў штодзённай сваёй працы павінны ісьці ўперадзе, быць прыкладам і паказам, быць сапраўднымі ініцыятарамі і застрэльшчыкамі калектывізацыі. Камуністы вёскі ўсе ў калгасы. Ніводнага вясковага камуніста па-за калгасамі.

Масавае правядзеньне „дню калектывізацыі" гэта ёсьць справа ня толькі працоўных сялян, а агульная справа ўсяе рабочае клясы, усёй савецкай грамадзкасьці.

Таварышы рабочыя! Арганізавана ўсімі сіламі на дапамогу вёсцы! На барацьбу за новыя формы аграмаджанай працы! На дапамогу калектывізацыі!

Таварышы батракі, беднякі і серадиякі! Дзень калектывізацыі гэта не „кампанія", а шырокае разгортваньне масавай упартай працы па сацыялістычнай перабудове вёскі. Арганізоўвайце сотні і тысячы новых буйных калгасаў і першастковых сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў! Тысячамі уваходзьце ў іх. Рашуча выкарчоўвайце карані капіталізму, вядзіце наступ на кулака, адхіляйце яго. У гэтым і толькі ў гэтым выхад з гэтага бядняцкага становішча, у якім яшчэ знаходзіцца беднейшае незаможнае сялянства.

Таварышы калгасьнікі! Абярніце „дзень калектывізацыі" ў масавы арганізаваны агляд старых калгасаў! Ужывайце ўсе захады да іх узбуйненьня! Аграмаджвайце ў іх працу і сродкі вытворчасьці. Пав̌лічвайце непадзельныя капіталы! Рашуча выганяйце з сваіх шэрагаў нядбайнасьць і няўважлівыя адносіны да гаспадаркі, якія яшчэ нагляд аюцца. Падніміце на адпаведную высату агра-тэхнічныя культурныя мерапрыёмствы! Пакажэце прыклад і ўзоры сваёй працы перад індывідуальнай сялянскай гаспадаркай!

Таварышы! Правядзеньне «дню калектывізацыі» таксама ўсямерна абярніце ў масавае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва, як унутры, так і сярод калгасаў, саўгасаў, кааператыўных арганізацый, асобных раёнаў, вёсак і бядняцка-серадняцкіх індывідуальных гаспадарак. Злучыце гэтае сацыялістычнае спаборніцтва з найлепшым правядзеньнем асеньняй пасяўной кампаніі, цалкам выканайце пляны па падняцьцю ўраджайнасьці, пашырэньню пасеўных плошчаў, правядзеньню аграмінімуму, стопроцантнай ачысткі насеньня і г. д. Арганізуйце масавую ўзаемадапамогу беднаце.

Таварышы рабочыя! Арганізуйце масавую дапамогу і выезды ў вёску праз свае рабочыя брыгады і шэфскія таварыствы.

Таварышы! Злучыце „дзень калектывізацыі" з масавай праверкай правільнасьці правядзеньня клясавай лініі ў працы ўсіх арганізацый, шчыльней згуртоўвайцеся навокал камуністычнай партыі і пад яе кіраўніцтвам узмацніце сваю ўвагу, актыўнасьць і арганізаванасьць па ажыўленьню працы саветаў, кааперацыі і ўсіх грамадзкіх арганізацый для сацыялістычнай перабудовы вёскі, шчыльней аб'яднайце свае шэрагі і дайце рашучы адпор усім вылазкам кулака і разьвівайце сьмела і рашуча наступ на яго.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б зьвяртае ўвагу ўсіх партыйных, камсамольскіх, савецкіх, прафэсыянальных, кааператыўных арганізацый і заклікае ўсю савецкую грамадзкасьць на неабходнасьць своечасовай, сур'ёзнай падрыхтоўкі для правядзеньня „дню калектывізацыі" і ўтварэньня навокал яго вельмі шырокай масавасьці з такім разьлікам, каб гэты дзень зьявіўся ня толькі прапагандай калектывізацыі, але, каб канкрэтныя пляны далейшага разгортваньня калгасаў і ўзмацненьня існуючых былі-б даведзены ў масавым парадку да кожнага калгасу, кааператыўнай арганізацыі, да кожнай вёскі і далі-б найлепшыя вынікі ў сацыялістычнай перабудове сялянскай гаспадаркі.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б заклікае ўсіх рабочых і працоўнае сялянства ў дзень рэлігійнага сьвята „Прачыстае" абярнуць у масавы дзень працы, ва ўсебеларускі дзень калектывізацыі у дзень будаўніцтва сацыялізму.

Усе сілы на правядзеньне масавага дню калектывізацыі.

ЦК КП(б)Б.

КРЫВАВАЯ РАСПРАВА

ФРАНЦУСКІЯ МАРАКІ АДМОВІЛІСЯ БЫЦЬ ЗБРОЯЙ ПРЫГНЕЧАНЬНЯ КАЛЁНІЯЛЬНЫХ ПРАЦОЎНЫХ.

33 памёрла, 200 зьняволена.

ПАРЫЖ, 16-8. „Юманітэ" пісала, што на крэйсары „Вальдэк Русо", які накіраваўся ў Кітай, выбухнула эпідэмія з-за гарачыні, вельмі цяжкай працы і дрэннага харчаваньня. На гэтай глебе ўзьніклі сярод экіпажу непарадкі, сурова прыдушаныя. Гэтыя паведамленьні францускім марскім міністрам абвяргаюцца. З гэтае прычыны газэта пытаецца, ці праўда, што на крэйсары памёрла 33 матросы, што 200 матросаў прысуджаны да зьняволеньня ў турме на тэрміны ад 2-х месяцаў да 2-х год.

Аб усім гэтым паведамлялася ў асобных абвестках, вывешаных у Пілонскім парту, аднак, урадавае абвяржэньне аб усім гэтым маўчыць, у чым «Юманітэ» ўгледжвае пацьверджаньне сваёй інфармацыі.

„Бунт" задушан крутымі мерамі.

ПАРЫЖ. Газэта «Юманітэ» паведамляе аб паўстаньні, якое выбухнула на борце францускага крэйсэру «Вальдэк Руссо». Водлуг вестак газэты, „Вальдэк Руссо" вышаў у ліпені з Тулону, каб зьмяніць крэйсэр „Мішле", які стаіць у кітайскіх водах.

Калі матросы пасьля адплыцьця з Тулону даведаліся аб месцы свайго прызначэньня, пачалося хваляваньне, якое было прыдушана вельмі крутымі мерамі.

У хуткім часе, з прычыны вялікае гарачыні і дрэннага харчаваньня, сярод экіпажу пачалася эпідэмія. З прычыны вялікай колькасьці хворых, камандваньне крэйсэру прымушала машыністаў і качагараў, якія засталіся здаровымі працаваць бязьзьменна на 3-е сутак. Апошнія адмовіліся ад працы і ў выніку пачаўся бунт, які быў спынен вельмі лютымі мерамі.

Як паведамляе газэта па некаторых вестках на барту памёрла 32 чал., з іх некаторыя ў выніку эпідэміі, а рэшта памёрлі па «невядомай» прычыне. Паводле слоў газэты, марская ўлада Тулону спрабавала замаўчаць гэтыя падзеі.

Крывавыя рэпрэсіі супроць маракоў.

ПАРЫЖ, 15-8. „Юманітэ" заклікае маракоў і рабочых патрабаваць тэрміновага звароту ў парты вайсковых суднаў, адасланых на Далёкі Ўсход з мэтаю прыдушэньня каленіяльных народаў, якія змагаюцца за сваю незалежнасьць, і з мэтаю нападу на СССР.

Камуніст Дорыё ўнёс у палату дэпутатаў запытаньне аб прычынах адасланьня вайсковых суднаў і таксама аб крывавых рэпрэсіях супроць маракоў крэйсэра „Вальдэк Русо", меўшых месца пасьля заходу крэйсэра ў Калумба (на Цэйлоне).

НА ГААГСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ.

УСТУПКА АНГЛІІ.

ГААГА, 17-8. Ангельскаму міністру Сноудэну перададзен агульны мэмарандум Францыі, Італіі, Бэльгіі і Японіі, на які даў адказ. Як мэмарандум, так і адказ Сноудэна трымаюцца ў тайне. З пэўных крыніц, аднак, удалося даведацца, што ў мэмарандуме зазначаецца на тое, што ўсе 5 дзяржаў (Францыя, Італія, Бэльгія, Японія і Нямеччына) згаджаюцца прыняць плян Юнга і толькі адна Англія выказваецца супроць яго.

На працягу першых гадоў Англія павінна атрымаць па рэпарацыйных выплатах больш таго, што яна павінна заплаціць Амэрыцы. Ліквідаваўшы канфіскаваную ў часе вайны нямецкую маёмасьць, Англія атрымала, апроч рэпарацый, суму, якая перавялічвае іх, і якой яна зараз дамагаецца. (Водлуг прыватных вестак, Англія атрымала гэтым шляхам міліярд марак). Усё-ж такі памянёныя дзяржавы хочуць пайсьці насустрач Англіі па некаторых пунктах.

Апроч мэмарандуму, прадстаўнікі 4-х дзяржаў далі Англіі зразумець, што яны згодзяцца на тое, каб банк міжнародных разьлікаў знаходзіўся ў Лёндане. Сноудэн, нібыта, адказаў, што ён лічыць гэтыя ўмовы ня зусім здавальняючымі. Аднак, думаюць, што становішча стала больш спрыяючым.

Адхіляюць.

ПАРЫЖ, 16-8. Агенцтва Гаваса паведамляе з Гаагі: «Катэгарычна адхіляецца паведамленьне з ангельскіх крыніц, згодна якога Францыя і Бэльгія нібыта робяць нажым на Італію, каб апошняя згадзілася на перагляд устаноўленай плянам Юнга процантнай схэмы разьмеркаваньня нямецкіх выплат між саюзьнікамі».

ПЛЕНУМ ЦК НЯМЕЦКАЕ КАМПАРТЫІ.

БЭРЛІН, 16-8. У Бэрліне ў працягу 2 дзён засядаў пленум ЦК нямецкае кампартыі. Даклад аб пленуме Выканкому Камінтэрну быў зроблен Рэммэле. У разгорнутай дыскусіі прынялі ўдзел многія члены ЦК з прадпрыёмстваў, прычым між выступаўшымі прамоўцамі назіралася поўнае аднадушша. Вынікі пленуму ЦК зафіксаваны аднагалосна прынятаю рэзалюцыяй. У гэтай рэзалюцыі ЦК КПН цалкам далучаецца да ўсіх пастаноў пленуму Выканкому Камінтэрну і высоўвае наступныя галоўныя задачы нямецкае партыі: „Энэргічная праправоўка пастаноў партыйнага зьезду ў Вэдынгу і 10-га пленуму Выканкому Камінтэрну, працягваньне анты-ваеннай кампаніі і скліканьне пралетарскага анты-ваеннага зьезду ў працягу зімніх месяцаў, неадкладнае заснаваньне інстытуту рэвалюцыйных упаўнаважаных на прадпрыёмствах, узмацненьне работы па разьвязваньню эканамічнае барацьбы і ператварэньне эканамічных боек у масавыя палітычныя забастоўкі, паскораньне ствярэньня пралетарскай самаабароны на заводах, узмоцненая ўвага і больш шырокая ініцыятыва ў галіне руху беспрацоўных, рашучае ўзмацненьне камуністычнай работы ў прафсаюзах, прыняцьце мер да павышэньня актыўнасьці неарганізаваных пралетарскіх мас, працягваньне барацьбы супроць сацыял-фашызму і буржуазнай рэспублікі, радыкальнае ператварэньне зусім нездавальняючай работы камсамолу, барацьба з паражэнчаскімі настроямі ўнутры партыі і рашучая барацьба супроць тэндэнцыі адставаньня ад тэмпу разьвіцьця масавага рэвалюцыйнага руху.

КІТАЙСКІЯ ПАГРОМШЧЫКІ НЯ СПЫНЯЮЦЬ ПРАВАКАЦЫІ.

ПРАВАКАЦЫЙНЫЯ НАПАДЫ.

(Паведамленьне ТАСС).

Правакацыйныя напады кітайскіх і белагвардзейскіх банд на нашу пагранічную варту і далейшыя спробы перайсьці на нашу тэрыторыю ня спыняюцца. 17 жніўня а 8 гадз. увечары банда кітайцаў і белагвардзейцаў перайшла нашу граніцу ў раёне сяла Палтаўскае (40 клм. на паўднёвы ўсход ад ст. Пагранічнай) і, абкружыўшы нашу заставу, якая знаходзілася ў трох кілёмэтрах ад граніцы (напрамак на Нікольск-Усурыйск) адкрыла ружэйны і кулямётны агонь. Падасьпеўшымі нашымі часьцямі наступ праціўніка быў хутка **ліквідаваны**, і бандыты **ў паніцы адступілі** на сваю тэрыторыю.

Чан-Кай-шы рыхтуецца.

ТОКІЁ, 16-8. Як паведамляе «Токіё Асахі» з Нанкіну, нанкінскі ўрад загадаў мукдэнцам захоўваць мірную пазіцыю ў адносінах да СССР і, як віндаць, ня траціць надзеі на мірнае вырашэньне пытаньня.

Адначасна ў Пэйпін выехала місія, пасланая Чан-Кай-Шы, якая, як думаюць, упаўнаважана праводзіць падрыхтоўку да абароны супроць магчымага наступу з боку СССР.

Масавыя звальненьні рабочых.

ТОКІЁ, 16-8. Водлуг паведамленьняў з Харбіну, на розных станцыях чыгункі арыштавана больш як 200 савецкіх служачых, якія дастаўлены ў Харбін. У Харбіне ўчынены новыя масавыя арышты. Устаноўлена цэнзура над тэлеграмамі. Тэлеграмы чужаземных карэспандэнтаў без цэнзуры не прапушчаюцца.

Водлуг таго-ж паведамленьня, адміністрацыя Усходня-Кітайскай чыгункі агаласіла афіцыйную заяву аб тым, што з прычыны фінансавых цяжкасьцяй яна ня мае магчымасьці разьлічыцца са звольненымі служачымі і асобамі, якія падаліся ў адстаўку.

Арыштаваных трымаюць у нялюдзкіх умовах

ТОКІЁ, 15-8. Як паведамляе агенцтва Сімбун Рэнго з Харбіну ад 16-га жніўня, кітайская паліцыя ня спыняе арыштаў сярод савецкіх грамадзян. У Хайлары арыштавана 10 савецкіх грамадзян, у Джалайноры—80 і на іншых станцыях—10 чалавек. Усе арыштаваныя разьмешчаны ў вагонах.

Арыштаваныя на ўсходняй лініі даставлены ў Харбін, дзе, чакаючы высылкі ў СССР, знаходзяцца ў спэцыяльным часовым канцэнтрацыйным лягеры за Харбінам.

Кітаец забіў белагвардзейца.

ТОКІЁ, 16-8. Як паведамляе агенцтва Сімбун з Харбіну, савецкія грамадзяне, арыштаваныя пры наскоку на савецкае консульства ў Харбіне (39 чалавек), абвясьцілі галадоўку ў знак пратэсту супроць адкладваньня суду.

Далей, агенцтва паведамляе, што белагвардзеец Шышкін, які актыўна дапамагае кітайскай паліцыі, учора ўначы цяжка паранен стрэлам з рэвальвэру на кітайскай вуліцы. Асоба, якая страляла, уцякла на аўтамабілі.

Цэлыя акругі ў руках чырвоных пік.

ПЭЙПІН, 16-8. Водлуг паведамленьня агенцтва Азіятык, у правінцыі Шандунь „пануе анархія". Акаваецца, што многія акругі ўсходняй часткі гэтай правінцыі ў руках чырвоных пік і іншых арганізацый сялянскай самаабароны, якія зьбіраюць падаткі, канфіскуюць маёмасьць багацейшых і г. д.

Насельніцтва масамі ўступае ў гэтыя арганізацыі.

Змаганьне рабочых з буржуазеяй.

САМАВОЛЬСТВА СУДОВАЙ УЛАДЫ.

ПАРЫЖ, 17-8. Вобыскі ў рабоча-сялянскім банку, а таксама ў рабочых кааператывах у Парыжы і прыгарадах, якія зьяўляюцца яго кліентамі, вынянцце дакумантаў і апячатаньне банку зроблены, як сьцьвярджае буржуазны друк, па падставе заключэньня, дадзенага судовым сьледзтвам. Ня гледзячы на адсутнасьць якіх-небудзь скаргаў і поўную спраўнасьць бягучых плацяжоў банку, фінансавая сэкцыя суду пастанавіла ўзбудзіць справу супроць банку. Праўленьне банку заявіла судоваму сьледчаму рашучы пратэст супроць самавольства судовай улады.

„Юманітэ" піша: „Тард'е (міністр унутраных спраў) хоча стварыць націку, каб зачыніць банк, які быў заўсёды на вышыні прад'яўляемых да яго патрабаваньняў. Захапляючы справаздачнасьць банку і канфіскуючы яго капіталы ўрад імкнецца, каб кліенты банку панесьлі страту і ў першую чаргу выдавецтва «Юманітэ».

Трацейская камісія ліквідуе.

ЛЁНДАН, 16-VIII. Рэйтэр паведамляе: „канфлікт у ангельскай баваўнянай прамысловасьці ўступіў учора ў новую стадыю, бо паміж прадстаўнікамі прадпрыёмцаў і прафсаюзаў адбылася згода аб перадачы канфлікту на трацейскае разгляданьне.

На падставе гэтай згоды, у панядзелак могуць аднавіць работу ўсе тыя фабрыкі, якія ў стане зрабіць гэта па тэхнічных умовах. Да сканчэньня трацейскага разгляданьня разьмер заработнай платы павінен заставацца на тым узроўні, які быў перад лёкаўтам».

*

ЛЁНДАН, 16-8. Прадстаўнік міністэрства працы Вільсон, які выступаў у якасьці пасрэдніка ў тэкстыльным канфлікце, агаласіў поўнасьцю ўмовы дасягнутае згоды:

1) прадпрыёмцы павінны зьвярнуцца ў трацейскую інстанцыю;

2) трацейская інстанцыя павінна разглядзець іх патрабаваньне аб зьніжэньні заработку на 12 з палов. проц.;

3) трацейская інстанцыя павінна вырашыць, ці мае падставу гэтае патрабаваньне прадпрыёмцаў і ў якой меры;

4) прадпрыёмцы і рабочыя абавязваюцца падпарадкавацца гэтай пастанове;

5) трацейская камісія складаецца з прадстаўнікоў прадпрыёмцаў і рабочых па два з кожнага боку і незалежнага старшыні, з узаемнае згоды бакоў, прычым старшыня мае права рашаючага голасу;

6) фабрыкі аднаўляюць працу 19 жніўня;

7) да часу вырашэньня арбітражнай камісіі рабочыя атрымліваюць ранейшую зарплату.

Пасьля сканчэньня перамоў прадпрыёмцы зьвярнуліся з пісьмовым запытаньнем да лідэраў прафсаюзаў, у якім яны просяць даць адказ, ці згодны саюзы, каб і ў будучым больш буйныя канфлікты рэгуляваліся шляхам арбітражу. Лідэры прафсаюзаў заявілі, што яны абгавораць гэтае пытаньне і дадуць адказ пазьней.

Ад імя міністэрства працы, Вільсон прапанаваў, каб прадпрыёмцы і прафсаюзы стварылі мяшаную камісію даўгатэрміновага характару і запрасілі ў яе незалежнага старшыню.

Патрабуюць больш крыві.

ВЕНА, 15-8. Зробленае ў Лупенях расьследваньне паказала з відавочнасьцю, што як умовы працы, так і адносіны да рабочых у значнай меры спрыялі ўзьнікненьню канфлікта. Апошняе не абвяргаецца і румынскім друкам. Ня гледзячы на крывавую разьвязку ўрад ня спыняе палітыкі тэрору. Аднак, усе гэтыя рэпрэсіі не здавальняюць лібэральны друк, які будучы ў апазіцыі да ўраду ўвесь час абвінавачвае яго ў тым, што ён, быццам, не вядзе дастаткова энэргічнай барацьбы супроць камуністаў, і сьцьвярджае, што дзякуючы гэтаму былі крывавыя сутычкі ў даліне Жылавы.

Забастоўка спынена.

ЛЁНДАН, 16-8. Рэтэр паведамляе, што пасьля нарады між прадпрыёмцамі і рабочымі забастоўка на прадпрыёмствах джутавай прамысловасьці спынена. У моц падпісанай згоды рабочыя будуць атрымліваць дадатковы заработак за тыя 6 гадзін, якія працуюць звыш 54-х гадзін у тыдзень, прычым гэтая розьніца ім будзе выплачана і за мінулы час з 1-га ліпеня. Прадпрыёмцы абавязаліся не накладаць ніякіх узысканьняў на ўдзельнікаў забастоўкі і станоўча аднесіліся да прапановы аб спэцыяльнай прыбаўцы работніцам на мацярынства.

Супроць фашызацыі вышэйшай школы.

БЭРЛІН, 16-8. Па ініцыятыве бэрлінскае арганізацыі чырвонага студэнцтва, у Рэйнзбэргу (Брандэнбург) адбылася канфэрэнцыя ўсіх студэнцкіх груповак Нямеччыны, якія стаяць на глебе рэвалюцыйнага сацыялізму. Канфэрэнцыя прыняла рэзалюцыю, у якой клянецца ў вернасьці Савецкаму Саюзу і пралетарскай рэвалюцыі ў Нямеччыне і заклікае да барацьбы супроць фашызму ў вышэйшай школе і супроць сацыял-дэмакратыі, якая ачышчае яму шлях.

ТРАМВАІ СТАЯЦЬ.

ПАРЫЖ, 12-8. Трамвайныя служачыя і рабочыя ў Наіцэ забаставалі ў адказ на адмаўленьне прадпрыемцаў здавольніць патрабаваньні аб павышэньні заработку.

Галадоўкай дабіваецца.

ПАРЫЖ, 13-8. Арыштаваны 13 ліпеня за продаж камсамольскай газэты «Авангард» камсамолец Ансэль абвясьціў галадоўку ў знак пратэсту супроць таго, што ў адносіне яго ня ўжываюць рэжыму палітычных зьняволеных.

Ансэль ня прымае харчоў ужо 8 дзён

Больш праў паліцыі.

ВЕНА, 13-8. Як паведамляюць з Бялграду, урад распрацуе дадатак да закону аб друку. Мяркуецца права канфіскацыі газэт прадаставіць поўнасьцю паліцыі.

Рэгулярнае суднаходзтва між СССР і ПАЭШ.

НЬЮ-ЁРК, 17-8. Амэрыканскае аддзяленьне таварыства «Дэрутра» падпісала з параходным таварыствам «Экспорт Стымшып» угавор, згодна якога гэтая кампанія адчыняе рэгулярныя тавара-пасажырскія рэйсы з Нью-Ёрку і іншых амэрыканскіх партоў у Адэсу, Новарасійск і Батум.

Рэйсы будуць наладжаны 2 разы на месяц. Лінія адчыняецца ў пачатку верасьня рэйсам на Адэсу. Працяг рэйсу намечан у 25 сутак. У выніку падпісаньня ўгавору ўпяршыню адчыняецца рэгулярнае суднаходзтва між Злучанымі Штатамі і СССР.

МАСАВАЕ БІЦЬЦЁ ЯЎРЭЯЎ.

КОЎНЯ. Рэдактар ковенскай яўрэйскай газэты «Ідышэ Штымме» аштрафавана на 600 літ і прысуджан да аднаго месяца турмы за зьмяшчэньне вестак аб масавым зьбіваньні яўрэяў у Коўні 1 і 2 жніўня.

Нумар „Дэйлі Тагеблят", у якім зьмешчан артыкул аб зьбіваньні, быў канфіскаваны літоўскаю паліцыяю зараз-жа пасьля яго дастаўкі ў газэтныя кіёскі.

Пахаваньне пралетарскага мастака.

БЭРЛІН, 14-8. Адбылося пахаваньне вядомага пралетарскага мастака Генрыха Цыльле. За труною ішло шмат рабочых, дэлегатаў ад прадпрыёмстваў і прадстаўнікоў розных арганізацый з чырвонымі сьцягамі і вянкамі. На магіле ад імя кампартыі выступіў прыяцель Цыльле дэпутат рэйхстагу Гэрнле. Выступілі таксама прадстаўнікі МОПР'у і Міжрабпому. Ад імя палітычных зьняволеных быў ускладзен на магілу вянок.

Прысутнічаў прадстаўнік паўсамоцнага прадстаўніцтва СССР т. Лорэнц. Калі ўдзельнікі пахаваньня разыходзіліся з могілкаў, здарылася сутычка рабочых з паліцыяй.

„Ціхая" ачысьцілася.

ЛЕДАКОЛ „СЕДАЎ", 12-8. Бухта Ціхая ачысьцілася ад крыг і экспэдыцыя, якая знаходзілася пад пагрозаю аварыі, пачала спакойна працаваць. Радыё-сувязь з сухазем'ем вельмі цяжкая з-за гарыстай мясцовасьці і далёкай адлегласьці. Увесь склад экспэдыцыі, у тым ліку Шмід і Самайловіч працуюць па пераносцы цэглы.

„Седаўцы" за працай.

ЛЁДАКОЛ «СЕДАЎ», 16-8. Выгрузка скончана. Ідзе ўнутранае заканчэньне будынкаў. 17 пачынаюць усяляцца ў галоўны дом пасяленцы. Для абслугоўваньня дырыжабля „граф Цэпэлін" мэтэаралёгічныя і аэралёгічныя назіраньні ў часе палёту дырыжабля будуць рабіцца больш часта.

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б

аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў

ад 16-га жніўня 1929 г.

пэрыяд мабілізацыі сіл і энэргіі рабочае клясы і шырокіх працоўных мас для выкананьня 5-цігодкі, для вырашэньня задач індустрыялізацыі краіны, соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, рашучага наступу на кулака і нэпмана ў пэрыяд абвастрэньня ваеннай небясьпекі перад партарганізацыяй паўстае вялікай важнасьці пытаньне—уцягнуць жаночыя рабоча-сялянскія масы ў актыўнае вырашэньне задач, якія стаяць перад партыяй і савецкай уладай на аснове рашэньняў XVI партканфэрэнцыі ЦК УсеКП(б) і XII зьезду КП(б)Б.

Выходзячы з гэтага, перавыбары дэлегацкіх сходаў павінны праходзіць як самастойная асаблівай важнасьці палітычная кампанія.

ЦК КП(б)Б прапануе парткомам завастрыць увагу ўсёй партарганізацыі, а таксама савецкіх, прафэсыйных, гаспадарчых і грамадска-палітычных арганізацый на рабоце дэлегацкіх сходаў як арганізаваным зьвяне сярод работніц і сялянак.

Перавыбары дэлегацкіх сходаў павінны праходзіць пад лёзунгамі:

Дэлегацкія сходы зьяўляюцца застрэльшчыкамі актыўнага ўдзелу жанчын у соцыялістычным спаборніцтве ў горадзе і на вёсцы.

Рацыяналізацыі вытворчасьці, узьняцьця прадукцыйнасьці працы і зьніжэньня сабекошту, за кваліфікацыю работніц у вытворчасьці, савгасьніц і калгасьніц на вёсцы, за здаровы быт, барацьбы з прагуламі і п'янкай.

Калектывізацыі вёскі, узьняцьця прадукцыйнасьці і таварнасьці сельскай гаспадаркі, правядзеньня поўнасьцю аграмінімуму, барацьбы з скажэньнем савецкіх законаў, барацьбы з кулацтвам і падкулачнікамі, барацьбы з бюракратызмам і больш рашучага вылучэньня работніц і сялянак на кіруючую работу.

За арганізаваны і рашучы адпор прачетарак, бяднячак у саюзе з серадняками—клясавым ворагам. За наступленьне на кулака і нэпмана.

За пагалоўную ліквідацыю няпісьменнасьці.

За ўзмацненьне інтэрнацыянальнага выхаваньня.

За ўзмацненьне абароны краіны—максымальнае навучаньне жанчын вайсковай справе. Кожная дэлегатка і дэлегацкі сход зьяўляюцца застрэльшчыкам і арганізатарамі ў справе ваенізацыі жанчын і падрыхтоўкі да абароны краіны.

У падрыхтоўчай рабоце да перавыбараў дэлегацкіх сходаў ЦК КП(б)Б прапануе наступнае:

1. у мэтах узмацненьня партыйнага ўплыву і павышэньня актыўнасьці работніц і сялянак, якія заняты ў соцыялістычным сэктары нашай гаспадаркі ў перавыбарчую кампанію ўзяць установку на максымальнае набліжэньне арганізацыі дэлегацкіх сходаў да прадпрыемстваў (фабрыка, завод, цэх, зьмена) і соцыялістычнага сэктару ў вёсцы (савгас, калгас, буйныя сельска-гасп. кааперацыйныя аб'яднаньні).

Асаблівую ўвагу зьвярнуць на ахоп дэлегацкімі сходамі батрачак.

Справаздачная кампанія дэлегатак павінна праходзіць пад пунктам погляду выкананьня мэтавай установкі ў рабоце дэлегацкіх сходаў.

2. Для больш пасьпяховага правядзеньня перавыбараў дэлегацкіх сходаў, неабходна ўлічыць канкрэтныя асаблівасьці кожнага прадпрыемства, раёну, вёскі і г. д., з тым, каб палепшыць і канкрэтызаваць палітычнае кіраўніцтва гэтай кампаніяй (прымежныя раёны, наліччы калгасаў, землеўпарадкаваньне, наліччы партарганізацый, жаночага актыву, наліччы прадпрыемстваў у раёне, асаблівасьці мястэчак і ўлічваньне кулацкай праслойкі).

3. ЦК КП(б)Б зварочвае ўвагу партарганізацыі на неабходнасьць узмацненьня партыйнага ўплыву на працоўныя масы і ўзмацненшасьцяў праз дэлегацкія сходы арганізацыя самастойных нацыянальных дэлегацкіх сходаў, сэкцый) забясьпечваючы пры гэтым строга клясавую лінію і парт. кіраўніцтва.

4. Склікаць інструкцыйныя нарады па лініі жанаддзелаў, ЦК АК і райкомаў, чошняя сумесна з кіраўнікамі дэлегацкіх сходаў і прадстаўнікамі ўстаноў да якіх былі прымацаваны дэлегаткі для практычнай работы.

5. Па лініі агульна-партыйнай прапрацаваць пытаньне аб выніках работы і перавыбарах дэлегацкіх сходаў на бюро і пленумах АК і РК, на партактывах і адкрытых партсходах ячэек.

6. ЦК ЛКСМБ намеціць канкрэтныя мерапрыемствы аб актыўным удзеле і дапамозе партыі ў перавыбарах дэлегатак.

7. Фракцыям ЦСПСБ,ЦВК і фракцыям акрвыканкомаў прапрацаваць адпаведныя ўказаньні нізавым савецкім, прафэсыйным і каапэрацыйным арганізацыям:

а) аб праверцы работы прымацаваных дэлегатак і вылучэнак з мэтай адбору лепшых для далейшага прасоўваньня на кіруючую работу;

б) канкрэтныя мерапрыемствы ўдзелу саветаў, профсаюзаў і каапэрацыі ў перавыбарнай кампаніі дэлегацкіх сходаў, падрыхтоўка гэтага пытаньня на пленумах саветаў, праўленьнях саюзаў сумесна з жаночым актывам.

8. Наркамасьветы, Наркам. Аховы здароўя распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы аб прыстасаваньні работы дзіцячых устаноў на час справаздача-перавыбарчай кампаніі (працягненьне рабочага дню, мабілізацыі працаўнікоў для абслугоўваньня аднадзённых дзіцячых устаноў). Тэрмін тыднёвы.

9. Белкаапсаюзу, Белсельсаюзу і Калгассаюзу даць дырэктывы:

а) аб вызначэньні сродкаў і памяшканьняў для арганізацыі аднадзённых дзіцячых устаноў;

б) аб прыстасаваньні работы каапэрацыйных крам, сталовак і г. д. (па часу) да справаздача-перавыбарчай кампаніі як у горадзе, так і на вёсцы.

10. Цэнтральным органам „Зьвязда“, „Савецкая Беларусь“, „Беларуская Вёска“, „Рабочий“, „Акцябр“, „Орка“, „Беларуская работніца і сялянка“ мясцоваму друку (акруговым, фабрычным і насьценным газэтам), а таксама акругкомам і райкомам высьвятляць перавыбары дэлегацкіх сходаў, як палітычную кампанію.

Даручыць Белдзяржкіно і радыё адпаведным парадкам высьвятляць кампанію перавыбараў у кіно і па радыё.

11. Акругкомам і райкомам правесьці вучот актыву старых дэлегатак з мэтай замацаваньня іх на практычнай рабоце і вылучэньня лепшай часткі на кіруючую работу ў саветы, каапэрацыю і профарганізацыі. Уцягненьне старых дэлегатак ва ўсе віды вучобы (вытворчыя курсы, агульна-адукацыйныя курсы, палітшколы і г. д.).

Вучэсьць актывістак дэлегатак работніц, батрачак, савгасьніц, калгасьніц і бяднячак для ўцягненьня іх у партыю, дзеля чаго арганізаваць з імі групавыя і індывідуальныя заняткі з прымацаваньнем да гэтай работы найбольш падрыхтаваных партыйцаў.

12. Акругкомам і райкомам прыняць рашутыя меры да забясьпечаньня арганізацыі аднадзённых дзіцячых устаноў пры клюбах, школах, хатах-чытальнях і г. д.

Для мабілізацыі грамадзкай думкі і падняцьця аўтарытэтнасьці дэлегатак, палепшаньня якаснага падбору і зьнішчэньня мэханічнага падбору дэлегатак, ЦК КП(б)Б прапануе:

1. Папярэдне абгаварыць кандыдатуры дэлегатак на агульным і жаночым актыву (прафэсыйным, каапэратыўным, савецкім, з батрачкамі і на групах беднаты).

2. АК, РК і ячэйкам на мясцох у працэсе перавыбараў правяраць правядзеньне гэтай работы на мясцох і ў выпадку, калі перавыбары праходзяць без патрэбнай мабілізацыі ўвагі мас і слаба падрыхтаваны кандыдатуры—выбары павінны быць адменены.

3. Перавыбарчую кампанію дэлегацкіх сходаў скарыстаць для вучоту палітычнага настрою і практычных прапаноў шырокіх мас работніц і сялянак.

4. Акругкомам і райкомам арганізаваць пераклічку паміж прадпрыемствамі, вёскамі і райкомамі аб ходзе перавыбарчай кампаніі (падрыхтоўка да перавыбараў, мабілізацыя грамадзкасьці, удзел савецкіх, каапэрацыйных і прафэсыйных арганізацый і інш.).

5. Для дапамогі нізавым партыйным арганізацыям у правядзеньні перавыбараў дэлегатак акругкомам забясьпечыць жывое кіраўніцтва з боку ўсёй партарганізацыі і мабілізаваць групу адказных камуністых і брыгад работніц для пасылкі на месцы.

5. Прапанаваць аддзелу па працы на вёсцы даць указаньні шэфарганізацыям аб мабілізацыі актыву для дапамогі вёсцы ў перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў.

6. Справаздачную кампанію закончыць да 15 верасьня. Усю работу па перавыбарах закончыць да 15 кастрычніка.

Тысячы пралетарыяў Менску вышлі прывітаць чырвоных байцоў.

Сустрэча байцоў.

Кветкі і зброя... Сталёвая вінтоўка і белая ружа. Як несаўмешчальна і дзіўна!

Але так было. На пляцу Волі. Учора—17 жніўня а 6-й гадзіне вечару.

Чакалі з нецярплівасьцю. Павінны зараз прыехаць. З хвіліны на хвіліну. Дарога расчышчана шырокая — будзе ехаць коньніца, па трое ў шэрагу.

— Едуць, едуць.

І тысячагалосае «ура» прывітала байцоў.

— У-у-р-р-а-а-а!

—Няхай жыве сувязь рабочае клясы з Чырвонай Арміяй!

— У-р-р-а-а!

Кветкі, падарункі. Друкары прынесьлі падшэфнаму эскадрону на кавалку мыла, пачцы папірос і блёк-ноту кожнаму чырвонаармейцу. Будаўнікі таксама. І гэтак кожны саюз. Падарункі не афіцыйныя, казённыя... Падарункі не ад устаноў і арганізацый... Самі рабочыя прынесьлі маленькую радасьць чырвонаармейцам, самі-ж даравалі іх.

— Кветкі кідай радавому...

— Чаму-ж не камандзіру?

— Так...

І ён, рабочы аднаго з заводаў Менску, ня ведае чым абгрунтаваць свой погляд.

— Радавому...

Пасьля ён растлумачыў гэта такім чынам:

— Камандзір заўсёды атрымлівае падарункі. От трэба радавому. Для яго гэта найвялікшая радасьць. Ён захавае кветкі на ўспамін.

Твары байцоў бронзавыя ад загару і падобны адзін да другога. Форма зьлівае іх у адну масу. У маналітную масу чырвонаармейцаў. І ня толькі знадворнае падабенства аб'ядноўвае гэтых людзей. Кожны з іх чалавек у поўным сэнсе гэтага слова, кожны мае ўласныя свае асаблівасьці. Але ў іх поглядах аднолькавыя, адзіныя, як і ў рабочых, што прышлі прывітаць іх звалотак з лягераў, бо яны сыны і браты той-жа клясы, якая вітае іх бурлівымі «ура», кветкамі і падарункамі. Рабочая кляса і Чырвоная армія, рабочы і чырвонаармеец, селянін і баец—адно і тое-ж, толькі ў розных выглядах і формах. У кожнага адны і тыя-ж інтарэсы, мэты і задачы.

— Зьнішчыць капіталізм.

— Пабудаваць сацыялізм.

І калі патрэбна будзе сканцэнтраваць сілы на адным фронце, на фронце вайсковым, увесь рабочы калектыў, усё працоўнае сялянства добраахвотна, па першаму загаду свайго ўраду, ператорыцца ў магутную, шматмільёнкую непераможную Чырвоную армію.

Гледзячы насустрэчу рабочымі Менску чырвонаармейцаў, міжвольна ўспамінаецца буржуазная армія, у прыватнасьці польская. Міжвольна ўспамінаецца кніжка палкоўніка С. Равецкага «Вулічныя бойкі», якую выдаў у гэтым годзе варшаўскі інстытут вайсковых навук. Мы ня можам устрымацца, каб ня прывесьці вытрымку з гэтае кніжкі.

„Усе беспарадкі звычайна пачынаюцца з масавых маніфэстацый. Для таго, каб пасьпяхова змагацца з гэтымі масамі, трэба ведаць іх псыхалёгію і сродкі ўзьдзейнічаньня на іх.

Першая ўмова для таго, каб не дапусьціць беспарадкаў, гэта забараніць і разганяць усякія сходы, масавыя зборышчы, маніфэстацыі. Але ў гэтых выпадках улада павінна дзейнічаць энэргічна.

Войскі павінны пасеяць страх. Нельга дапусьціць, каб салдаты засядалі, альбо перагаварваліся з масай. Войскі павінны быць разьмеркаваны на адлегласьці 35 мэтраў ад сабраўшыхся, бо толькі ў такім выпадку магчыма вольнае скарыстаньне зброі.

Разьмеркаваньне войск у непасрэднай блізкасьці да масаў прывядзе да таго, што салдаты зьмяшаюцца з маніфэстантамі і нарэшце будуць абяззброены.

Трэба пакончыць з прывычкай устрымлівацца ад ужываньня зброі да таго часу, пакуль удзельнікі беспарадкаў самі не нападаюць на войскі. Такая тактыка ня можа быць прызнана правільнай. Ні ў якім разе нельга страляць у паветра, гэта толькі абадзёрвае масу і выклікае сьмешныя адносіны да вайсковае сілы, трэба мецца як сьлед. Вельмі мэтазгодна страляць на нагах. Няхай масы пераканаюцца ў тым, што з войскамі жартаваць нельга.

Часта дэманстранты прыбягаюць да такой хітрасьці: наперадзе яны выстаўляюць шэрагі з жанчын і дзяцей спадзяючыся на тое, што салдаты ня будуць страляць. У такіх выпадках трэба разгарнуць пярэднія шарэнгі халоднай зброяй, а задні занідаць ручнымі гранатамі“.

Наймацнейшы кантраст. Зрабіце кругасьветнае падарожжа, пабудзьце ў тропіках і двух канцавосьсях і вы нідзе ня сустрэнеце мацнейшага кантрасту. Служка фашызму ў часе апошняй вар'яцкай трасцы паказаў увесь свой агіднейшы твар. Скінуў вуаль і прадстаў ва ўсёй нагаце.

Камэнтарыяў не патрабуецца. Зразумела і так. Чырвонаармейцы ня толькі «перагаварваюцца» з масамі, але яны самі—маса, самі—пралетарыят, самі працоўнае сялянства.

Эр.

Шчыра вітаем чырвоных байцоў.

Вечар. Гудзіць курсантскі вулей. Гэта курсанты 4-х і 6-цімесячных настаўніцкіх курсаў сабраліся на аб'яднаны нечарговы агульны сход. На сходзе 248 чалавек. На абвестцы дню адно цікавае пытаньне... Сустрэча чырвоных байцоў прыбываючых з лягераў.

У курсантаў вырываецца з грудзей шчырае «Наладзім спатканьне»!! „Нарыхтуем кветак нашым вартаўнікам пралетарскае бацькаўшчыны“, «Пабудуем самалёт». Гэта будзе лепшы падарунак лепшая кветка для Чырвонай арміі... Падпішамся ўсе пагалоўна на 3-ю пазыку індустрыялізацыі... Наладзім вызавы і спаборніцтва паміж 4-х месячнымі і 6-цімесячнымі настаўніцкімі курсамі на большы лік і на большую суму падпіскі на пазыку індустрыялізацыі.

Лапіцкі Р.

Зброя знаходзіцца ў надзейных руках.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам камандзір № кавалерыйскага корпусу т. **Цімашэнка** падзяліўся сваімі ўражаньнямі наконт падрыхтоўкі чырвонаармейцаў корпусу ў сувязі з сканчэньнем лягернай вучобы.

— Мы маем поўныя весткі аб тым,—сказаў т. Цімашэнка,—што страявая і тактычная падрыхтоўка № кавалерыйскага корпуса імя Беларускай ССР, у параўнаньні з мінулым годам, значна палепшылася. Па-за шэрагамі страявой службы мы маем барацьбіта-рэвалюцыянэра, адважнага грамадзяніна, а ў страю—дысцыплінаванага чырвонаармейца і камандзіра.

— Усе чырвонаармейцы наогул, зазначыў т. Цімашэнка,—выглядаюць фізычна разьвітымі і моцнымі, чырвонаамейцы дасягнулі роўных палявых алюраў і добрага тэхнічнага ўладаньня аружжам і канём. Трэба таксама зазначыць і тое, што чырвонаармейцы добра ведаюць абавязкі байца і даскана арыентуюцца ў кожнай мясцовасьці, у выпадку патрэбы чырвонаармейцы могуць замяшчаць малодшы камсклад.

Гэткіх посьпехаў у вывучцы чырвонаармейцаў мы дабіліся дзякуючы спрыяючым лягерным умовам.

Гаворачы аб стралковай падрыхтоўцы палкоў № корпуса, т. Цімашэнка зазначыў аб вялікіх посьпехах у працы начскладу і адпаведнай увагі з боку чырвонаармейцаў.

Мы маем такія процанты выкананьня праведзеных інструктарскіх стрэлаў, якія сьведчаць аб высокай стралковай падрыхтоўцы нашых палкоў. Тэхнічныя часьці ўпяршыню выходзілі сёлета ў лягеры. У параўнаньні з мінулым годам такія часьці і часьці сувязі значна павысілі сваю вывучку. У артылерыстаў асабліва выдзеляецца вялікая чоткасьць і граматнасьць у рабоце малодшага камскладу.

К. У.

Ліквідаваць прарыў.

(Малюнак з лягернай вучобы).

Сыгнал ражка прарэзвае начную ціш лягеру, падхопліваецца сутачным нарадам і слова п-а-а-дым-а-а-а-йсь раскатваецца па ўсяму лягеру.

4 гадзіны раніцы. Усе ў баявым парадку. Рушацца калёны байцоў і гэты рух падтрымлівае артылерыя сваімі коламі. Рух калёны праходзіць ціха, дысцыпліна маршу падтрымліваецца добра, чуваць толькі лязг капыт і гуркатаньне артылерыі.

Перад пачаткам руху камандзірам была растлумачана з а д а ч а байцам:—„Працiўнік“ прарваў наш фронт і знаходзіцца зараз ад нас за 30 кілёмэтраў. Задача нашых частак ліквідаваць гэты прарыў і адцясьніць „працiўніка“.

Зусім супакойна рушыцца калёна па лесе. Раптам паказаўся ў паветры самалёт. Калёна зьвярнула з дарогі ў лес і рассыпалася, але самалёт ляцеў амаль што над самым лесам і прыкмеціў рух вялікай калёны.

Самалёт пачаў рабіць кругі ў паветры і з кожным разам усё ніжэй і ніжэй спускаўся над калёнай, каб апазнаць часткі.

Ужо з боку калёны былі выстаўлены куляметы, дзеля стральбы па самалётам, але не адчыняя агню—чакалі загаду.

Сярод байцоў пачаліся спрэчкі аб тым чый самалёт, і якая мэта яго паяўленьня.

Але ўсе гэтыя спрэчкі былі хутка зьнішчаны. На трэцім кругавым палёце, над рассыпаўшаюся ў лесе калёнаю ён скінуў вымпел (данясеньне): „У раёне в. Дубнікі абнаружана калёна працiўніка даўжынёю ў 1.5 кілёмэтра“.

Камандны склад зараз-жа перадаў сутнасьць данясеньня ўсім байцам і спрэчкі замоўклі.

Кожны ўжо ведаў, што гэты самалёт быў наш і што ён шукаў галаву калёны каб скінуць вымпел і перадаць данясеньне начальніку калёны.

Калёна рушылася далей. Дарога ідзе сярод рэдкага сасоньніку і з левага боку ўжо праглядаецца поле, на якім роўнымі шэрагамі разьмяркаваліся абабкі залацістага жыта. Не пасьпелі праехаць яшчэ і кілёмэтру, як над калёнаю зноў паказаліся тры самалёты.

Загадзя перадаецца каманда: „повад у права“ і калёна зноў рассыпалася па лесе, скарыстоўваючы ўсе цянкі лесу, каб захаваць сябе і ня выдаць сваю прысутнасьць самалётам.

Хвілін 15 зрабілі вытрымку. Самалёты паляцелі далей і мы супакойна пачалі прасоўвацца далей, з кожным крокам усе бліжэй і бліжэй да працiўніка.

Выведка пачала даносіць больш сталыя зьвесткі аб працiўніку і мы хутка былі сьведкамі сутычкі нашых перадавых частак з працiўнікам.

Рашыўшы задачы камандзіры пачалі прыступаць да іх выкананьня. Пяхота хутка разьвярнулася і пачала наступленьне на „працiўніка“. Артылерыя падтрымлівала яе сваім агнём.

Пад моцным агнём нашых частак „працiўнік“ пачаў адступаць і камандаваньне паставіла байцам другую задачу—агнявога парадку.

Другая палова нашага вучэньня заключалася ў тым, каб паказаць на практыцы байцам яшчэ раз наступленьне пяхоты пры падтрымліваньні свае артылерыі.

А. Лапаеў.

Фэльетон.

Фантазія і рэчаіснасьць.

... **Памятую:** доўгія калядныя вечары дзеда Антося. Яго лагодную, ціхую, як шалясьценьне лісьцяў, казку пра балота, людзей-асілкаў і залатое шчасьце.

— От і пашлі яны і пашлі. Ідуць лясамі, палямі, лагчынамі два браты: Сымон і Анісім. Ідуць на далёкую чужыну шукаць шчасьця. Шчасьце пад дубам-волатам закапана, і не простае шчасьце, а залатое. Дуб-волат стаіць за трыдзевяць зямель, за сінім завірушным морам. Ахоўваюць яго дванаццаць малайцоў-асілкаў. І не падыйсьці да іх, не паказацца на вочы: схопяць, пакладуць пад корч і каменем прыцісьнуць.

І расказвае прыгожа і люба расказвае дзед Антось. Наша дзіцячая фантазія словы пратварае ў дзіўныя казачныя вобразы. За вакном сьцюжы рагоча і сьвішча, а нам думаецца, што дванаццаць малайцоў-асілкаў песьню пяюць. Вось яны едуць на конях нявконскай пароды. Па зямлі і паветры, лясох і балотах. Адзін падобен на Ільлю Мурамца, другі—на Мікіту Дабрыніча, трэці—на Алёшу Паповіча.

Хто пераможа дванаццаць малайцоў? Хто пераможа дванаццаць асілкаў? Хто адкапае залатое шчасьце пад дубам-волатам?

Ніхто. Ніколі.

Гіне Анісім, Гіне Сымон. Гінуць тысячы сымонаў-анісімаў.

Волат-дуб правальваецца ў нетры зямлі і на яго месца зьяўляецца крыніца жывой і мёртвай вады. Жывую ваду сонца кліча ў госьці да сябе, і яна ўзьнімаецца малачэвымі туманамі па неба. Мёртвая вада разьліваецца па зямлі, затапляе сёлы і гарады. Балотам завуць тую мясьціну людзі. Палесьсем празвалі пазьней.

Аганькі залатога шчасьця кожны вечар блудзяць па балоце. Як пакажуцца зоры на небе, так і выходзяць яны з нетраў балотных. Блудзяць, плаваюць па балоце яны, але ніколі чалавек ня сустрэне іх. Усёй вёскай хадзілі на балота, аблаву рабілі на блудлівыя аганькі, але нічога ня выходзіла—і „чур на месцы“ не дапамагаў, і кветкі папараці ў купальскую ноч не расьцьвіталі. Падыходзіш да аганька, а ён усё далей, далей, у самыя непраходныя мясьціны заходзе, у багавіньне правальваецца.

А людзі ідуць і топяцца, топяцца і ідуць. Многа загунула іх, не палічыць дзеду Антосю. І ніхто з іх не злавіў блудлівы агоньчык—залатое шчасьце, залаты скарб спадчыны.

... **Бачу:** жытнюю сьцяну, аўсяную сьцяну і сьцяну малін. Праўдзівей кажучы, покуль што бачу адну сьцяну малін. Н а м е с ь н і к дырэктара тарфяной станцыі навукова-дасьледчага інстытуту тав. Шыперка чытае лекцыю аб балотах Беларусі, іх скарыстаньні і аб тэй карысьці, якую яны дадуць рэспубліцы ў бліжэйшай будучыні; а мы (рэдактар „СБ“ Шастакоў, супрацоўнік Паскрэбка, Нам. НДІ Беларусі Мікуліч і я) ловім ягады маліны ў кустох... Чутны словы Шыперкі:

— Мы здымаем з гэктара 2100 кілёграм малін. Гэта каштуе звыш 1500 руб. Самая выгадная расьліна, асабліва ў прыгародных гаспадарках дзе блізка рынак збыту.

За канаваю пачынаюцца аўсы. Дзесяткі гатункаў засеяны на дзялянках. Вывучаецца ўраджайнасьць і ўстойлівасьць.

— Калі ў сялянскай гаспадарцы самы найвялікшы ўраджай аўса 60—70 пудоў, то ў нас 270—300 пудоў.

«Экскурсанты» пажымаюць плячыма.

Глядзіш на іх і сам дзівісься: хіба яны ня ведаюць аб гэтым? Як ня сорамна, але трэба прызнацца: ня ведаюць. Ня ведаем мы—савецкая грамадзкасьць—аб дасягненьнях тарфяной станцыі, што ў двух кілёмэтрах ад Менску.

Хто вам казаў, дзе вы чыталі, што каля Менску, на балоце, на багавіньні здымаюць 200 пудоў жыта з гэктару, 200 пудоў ячменю, 6000 пудоў турнэпсу?!

Галава Шастакова ледзь відаць з-за калосься жыта. Буйнае, ядранае, высокае—здаецца, пяткускага гатунку.

— Фатографа-б сюды... Кіно-апэратара...

— Цябе зазьняць.

— А хоць-бы і цябе. Ячмень той качаны капусты, маліну, бульбу, канюшыну. Даць паэму пра балоты... Баляду аб чорным золаце. Кіно-раман аб гаспадарчай рэвалюцыі.

— І каханьне ў карціну... «Луну с правой стороны»...

— Хіба на балоце гэтага ня можа быць? Хіба толькі каўтун і казкі жывуць тут? Дзе людзі—там і каханьне. А на балоце людзі—гэроі. Таму і каханьне ў іх „рыцарскае“...

— Перад краінай вялікая будучыня,—перабівае Шыперка.—Мы шчасьлівы, што балоты займаюць 20 проц. тэрыторыі Беларусі. У іх захаван а вялікае багацьце. Тарфянікі па якасьці куды вышэй за украінскія чарназёмы.

Я міжвольна ўспомніў дзеда Антося і яго казкі пра балоты. І хацелася сказаць яму:—Блудлівыя аганькі залатога шчасьця знойдзены. Знойдзены, дзед. Знайшлі іх бяз кветак папараці і ня ў купальскую ноч.

Асушылі твань, апрацавалі глебу, засеялі збожжа. І блудлівыя аганькі пачалі подаці плаціць. Плацяць многа—больш, чым па тысячы рублёў з дзесяціны. І табе, дзед, прыдзецца так зрабіць. Ня казкі расказваць, а Дзеразоў мох трэба асушыць. Блудлівыя аганькі зробяцца цукравымі буракамі і пяткускім жытам. Фантазія казак ператорыцца ў быль рэчаіснасьці.

Цім. Зарэчны.

Конкурс па экспартных нарыхтоўках.

Ворша, 17-8. Распачаўся акруговы конкурс на лепшы раён па правядзеньню нарыхтовак экспартнай другарадпай сыравіны. Мэты конкурсу—стварэньне грамадзкай думкі сярод шырокіх мас насельніцтва аб важнасьці і карысьці зьбіраньня і захаваньня розных адкідаў у гаспадарцы—рызьзе, косьці, кішкі, рогі, капыты, пробкі, папяровая макулатура і г. д. і важнасьці загатовак гэтых другарадных тавараў у мэтах іх экспарту. Скончыцца конкурс 1 кастрычніка. Лепшым раёнам па правядзеньню нарыхтовак і ўдзелу ў конкурсе будуць выданы прэміі ад 400 да 750 р. грашыма, альбо рэчамі. У правядзеньне конкурсу ўцягнуты партыйныя ячэйкі, камсамол, піянэры, настаўнікі, жаночы актыў, сельсаветы, камітэты ўзаемадапамогі, дзяржаўныя і каапэратыўныя загатавіцельныя арганізацыі, праф саюзы, аграномы, актыў пайнікаў каапэрацыі і вясковы бядняцка-серадняцкі актыў.

У сваю чаргу акрвыканком абавязаў усе загатоўчыя арганізацыі забясьпечыць усе раёны патрэбнай колькасьцю агітматар'ялаў, паладзіць сталы інструктаж раёнаў і нізавой загатоўчай сеткі, шляхам высэдаў адказных працаўнікоў у раёны.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на тыя раёны, якія да гэтага часу яшчэ ня былі ўцягнуты ў другарадныя загатоўкі.

Акруговай інспэкцыі гандлю даручана сачыць за ходам загатовак і за выкананьнем дырэктыў па правядзеньню конкурсу.

Гэты конкурс значна падштурхне адсталы від загатовак другарадных экспартных тавараў і навучыць сялян, як дабываць сродкі для гаспадаркі з адкідаў той-жа гаспадаркі.

А. К.

Р. Краус.

„Чорнае золата“*)

IV.

Міханавіцкае балота, як галоўны асяродак тарфяной станцыі—ідэальнае месца. Недалёкая адлегласьць ад Менску, ад чыгункі, урэшце добрая якасьць тарфянага масыву—усё гэта робіць Міханавіцкую тарфяную гаспадарку надзвычайна ўдалай.

Першае знаёмства з працамі станцыі адбылося ў доміку сыстэмы Гэрарда, пабудаваным на сухадольным вучастку, які прылягае да балота. Сухадольны вучастак замацаваны за станцыяй, на ім адбываюцца дасьледчыя работы па ўжываньню торфу ў сельскай гаспадарцы. У доміку, які зьвяртае на сябе ўвагу сваёй арыгінальнай архітэктурай, разьмешчана дапаможная лябораторыя (галоўная ў Менску) і кватэры навуковых супрацоўнікаў. Зараз там толькі дзьве навуковых працаўніцы, якія робяць гэоботанічныя досьледы балота. Яны сабралі вялікі гэрбары, ня гледзячы на ўсю беднасьць балотнае флёры. Там мы азнаёміліся з надзвычайнымі ўласьцівасьцямі загардушкі, што дае магчымасьць вызначыць штогодны прырост балота. Загардушка (Drosera) з году ў год дае акружкі лісьцяў, якія разьмяркоўваюцца паверх сфагнавага (мохавага) пакрову, у сярэдзіне ж моху заўсёды захоўваюцца акружкі лісьцяў мінулых гадоў. Вымяраючы адлегласьць паміж акружкамі, можна даведацца, якая таўшчыня моху нарасла за адзін-два-тры гады. Такім чынам, было вызначана, што прырост сфагнума найбольш высокі, у параўнаньні з Нямеччынай, Расеяй, Фінляндыяй,—у Беларускім Палесьсі (ад 2 да 3 з паловаю сантымэтраў у год).

Цяпер узмоцненым тэмпам ідзе прыродазнаўчае вывучэньне Міханавіцкага балота. Геоботанічныя, гэолёгічныя, гідралёгічныя і тэхнічныя дасьледваньні ідуць поўным тэмпам. Узята да 2.000 спроб торфу на рознай глыбіні па дзьвюх магістралях—упоперак і ўздоўж. Гэтыя спробы і аналізы, як наогул дэталёвае вывучэньне балот, важны ня толькі дзеля вывучэньня. Дробны факт—як трэба быць асьцярожным, пачынаючы эксплёатацыю любога балота. Наркамзем меркаваў арганізаваць у Міханавічах торфа-подсьцільны завод. Але для гэтага патрэбна мохавае балота з мала пагнілым торфам і каб быў пласт ня менш аднаго мэтра. Міханавіцкае балота да гэтага не падыходзіць, і завод, які каштуе 50 тысяч рублёў, стаяў-бы без карысьці. Такія пытаньні, вядома, нельга вырашыць адміністрацыйна. Адміністрацыйнае вырашэньне пытаньняў, ня ведаючы добра рэчы, гэта тое самае, што „земгусарскі“ падыход спэцыяліста абы да якога праэкту. Між іншым, у Гомельшчыне на Закрашынскім імху будуецца торфа подсьцільны завод. Пытаньне вельмі спрэчнае—ці хопіць там патрэбнага торфу? Аднак, нехта запэўняе, што хопіць, а нехта забыўся, што трэба „катэгарычна сьцьвярджаць“ толькі тады, калі можна гэта сьцьвярджэньне давесьці.

Шырокае вывучэньне балот з пункту гледжаньня ўласьцівасьці торфу ў Беларусі мяркуецца з наступнага году. У Расеі яно пачалося прыблізна з 1908 году. Мы спазьніліся на цэлы прызыўны ўзрост, але мы яшчэ больш спазьніліся ў сувязі з неабходнасьцю выявіць энэргетычныя рэсурсы для індустрыялізацыі краіны.

Пастаноўка вывучэньня балот у нас наогул дзіўная. Нехта па прастаце душэўнай, а можа і па інжэнэрскай спрытнасьці, увёў прыблізна такую сыстэму. Вывучае балота гідратэхнік, за ім культуртэхнік, пасьля торфмэйстар, лясное ведамства, партыі колфонду, і калі даецца магчымасьць арганізаваць рыбную гаспадарку, то вывучае балота і рыбнае кіраўніцтва. Гэткае багатае вывучэньне прыводзіць урэшце да таго, што ніводнае вывучэньне ня бывае ўсебаковым. Комплекснае вывучэньне, бясспрэчна, было-б карысным, але-ж кожнаму хочацца быць „гаспадаром“ свае галіны. Так і гаспадараць памаленьку, а ў рашучыя моманты „катэгарычна сьцьвярджаюць“.

Рэшту дня і большую частку вечара мы прабылі ў лябораторыі. Тав. Бахцееў увесь час дзівіў мяне празнымі веткамі пра торф, пра яго ўласьцівасьці, пра карыснасьць. Гэта лекцыя была насычана лічбамі і фактамі. Лічбы дзівілі, але яны датычылі Савецкага Саюзу. Факты разнастайнасьці скарыстоўваньня торфу дзівілі таксама, але яны адносіліся да Заходняе Эўропы.

Думка нехаця прыходзіла да сынтэзу: да саюзных запасаў торфу трэба прыстасаваць усе вядомыя ў сьвеце формы скарыстоўваньня яго. На гэта ў нас ёсьць усе данныя, на гэты шлях мы фактычна і ўступаем.

V.

Раніцою мы вышлі з гэрардаўскага доміку, каб дэталёва агледзіць балота, тарфяныя распрацоўкі, машыны, торф, які прасыхае і ўжо складзен у штабелі. Ідучы яшчэ па росным імху, я думаў пра той недалёкі час, калі ня толькі Міханавіцкае балота, але тысячы такіх балот, вялізарныя масывы ў дзесяткі тысяч гектараў будуць раскарчоўвацца, выраўноўвацца калі на багністым імху пастануць тарфяныя машыны, вырастуць штабелі тарфяных плітак, і сонечная энэргія, некалі атрыманая зямлёю вось ад гэтага, такога яскравага сёньня сонца, будзе ў выглядзе мэханічнае энэргіі служыць чалавеку. Першы пачатак у Беларусі ўжо зроблены. Асінбуд—гэта ня толькі электрастанцыя, што павінна харчаваць заводы і фабрыкі, гэта пачатак правільнага, найбольш выгаднага для сёньнешняга дню скарыстаньня асноўных энэргетычных рэсурсаў краіны. Беларуская Цэнтральная Тарфяная дасьледчая станцыя павінна вывучаць балоты для новых Асінбудаў.

Тав. Бахцееў перарваў ход маіх думак. Ён надумаўся паўтарыць сваю лекцыю, ілюструючы фактамі з практыкі станцыі. У маёй галаве, чалавека далёкага ад інжынэрнае справы, не маглі ўтрымацца ўсе лічбы і факты. Думаю, што Белдзяржвыдавецтву разам з Наркамземам давядзецца выдаць цэлую бібліатэку па торфу, каб усе ведалі як мага больш пра торф.

У некалькі бліжэйшых стагодзьдзяў запасы каменнага вугля на зямлі будуць вычарпаны. Перад шэрагам краін ужо даўно паўстала пытаньне пра больш рацыянальнае скарыстаньне энэргетычных рэсурсаў, пра больш раўнамернае скарыстаньне паасобных відаў апалу, пра адшуканьне новых энэргетычных баз. Перад Савецкім Саюзам такая задача стаіць таксама. У 1926-27 годзе ў агульным балянсе апалу Савецкага Саюзу займаюць наступныя месцы: дровы—47 проц., каменны вугаль—39 проц., нафта—10 проц. і торф—4 проц. Гэта ў той час, калі ў Саюзе ёсьць 78 проц. сусьветных запасаў торфу і торф стаіць на другім месцы паводле запасаў апалу Саюзу (27,5 проц.).

Выдаткаваньне гэткае каштоўнае крыніцы энэргіі, як нафта, ужо штурхае да канешнае патрэбы большага скарыстаньня торфу. Аб гэтым прымушае думаць і надмерная эксплёатацыя лесу на апал. Будучы на трэцім месцы паводле колькасьці, лес паводле карыстаньня пападае на першае месца. Даўно ўжо стала ясна нявыгаднасьць вырубкі лесу на апал. Дарагая даставка, меншая колькасьць цеплавой энэргіі ў параўнаньні з добрым торфам, абмяльчэньне рэчак, павялічэньне плошчаў нескарыстаных земляў, зьмена клімату, урэшце больш мэтазгоднае скарыстаньне лесу, як будаўнічага матар'ялу—даўно паказала на торф, як найбольш здатны матар'ял для апалу.

У Беларусі асноўнаю базаю энэргетычных рэсурсаў трэба лічыць лес і торф. Нафта, вугаль—гэта трэба прывозіць здалёк, і наўрад ці зможа на прывазным апале разьвівацца прамысловасьць Беларусі. Ды гэтага і ня трэба, бо запасы торфу ў Беларусі паводле самых няпоўных і сьпісаных падлікаў складаюць 10 мільярдаў куб. мэтраў сырога торфу. Пры пераводзе на паветрана-сухі торф, што здольны гарэць у кацельных устаноўках і звычайных хатніх печках, мы маем мінімум 3100 мільёнаў куб. мэтраў торфу. Наколькі вялікія гэтыя запасы торфу, відаць, калі параўнаць іх з драўнінаю: яны ў чатыры разы перавышаюць запасы драўніны ўсяе Беларусі.

Торф—асноўная энэргетычная база Савецкае Беларусі. Бяз шырокага скарыстаньня торфу нельга сур'ёзна гаварыць пра індустрыялізацыю Беларусі. І калі сёньня мы аддаём вялікую ўвагу лесу, дык было-б больш правільным значную частку гэтае ўвагі аддаваць торфу. Энэргетычныя рэсурсы сьвету раскіданы па ўсёй зямлі. На долю Беларусі выпаў толькі торф.

VI.

На Міханавіцкім балоце я бачыў тарфяныя машыны. Прастата іх канструкцыі зьдзівіць кожнага, нават селяніна з глухой Мазыршчыны. Каленчаты элеватар, упушчаны ў кар'ер, робіць больш лёгкай працу рабочага, што накідае тарфяную масу. Прас, своеасаблівая торфарубка, перамолвае і выпіхае тарфяныя цэгліны праз дубальтовы мунштук, транспартар на 250 мэтраў у бок ад кар'еру адвозіць гатовыя для прасушкі цэгліны. Усё гэта рушыцца лёкамабілем. Машына, што працавала ў кар'еры, была ўзору 1928 г., сыстэмы „інсторфу“. На двары тарфянага пасёлку каля баракаў стаяла новая машына сыстэмы інжынэра Сіманенка. Яе толькі пачалі зьбіраць і хутка перавязуць на балота для спробы. Элеватар гэтае машыны мае ўжо рэгулятар, які забясьпечвае раўнамерную падачу тарфянае масы. 1 транспартар і элеватар можна перасоўваць у бакі, а гэта ўжо эканомія сіл, эканомія часу ў сувязі з больш рэдкімі перасоўкамі машын уздоўж кар'еру.

Мы будзем усімі сіламі разьвіваць саматужную сялянскую здабычу торфу. **Але мераць нашы посьпехі ў торфаздабываньні мы павінны колькасьцю машын і іх сыстэмамі.** Ручная здабыча торфу—гэта змушаная ўступка мінуламу, першы этап пранікненьня торфу ў дробную сялянскую гаспадарку.

Як-бы ні былі своеасаблівы кратовыя норы саматужніка-адзіночкі, ці больш гэомэтрычныя па форме месцы выміны тарфянога таварыства,—гэта ўсё-такі норы.

Наяўнасьць сонечных дзён забясьпечвае пасьпяховасьць тарфянога сэзону. Тарфяная машына гарантуе эканомію часу, лепшае скарыстаньне гэтых сонечных дзён (гэтае падвойнае радасьці кожнага торфмэйстэра), зьніжэньне цэн на апал і, калі хочаце, зьніжэньне цэн на прамысловыя тавары. Пранікненьне машыны ў балота пачалося.

Праз дзесяць год мы яшчэ ня здолеем сказаць, што ўсюды на палёх сельска-гаспадарчага карыстаньня ўжо працуюць машыны. Але мысьліць балота без тарфянае машыны мы адвучымся хутка.

Уладаючы вялікімі запасамі торфу, маючы магчымасьць дастаць машыны, мы ня маем кадраў тарфянікаў. На Асінбудзе працуюць арцелі калускіх, разанскіх, цьвярскіх.

Ад гэтых арцеляў шмат у чым залежыць пасьпяховасьць здабычу торфу. Праблема торфу патрабуе вырашэньня праблемы кадраў людзей.

На Міханавіцкім балоце тарфяная машына ў адну зьмену можа даваць 60 тысяч цэглін. Была пастаўлена задача, каб арцель у адну зьмену давала хоць-бы 32 тыс. цэглін. Некваліфікаваныя рабочыя, набраныя з валочных вёсак, працуюць з вялікімі зрывамі. Хістаньні здабычы рэзкія—ад 8 да 40 тыс. у зьмену.

У сярэднім летась у зьмену рабілася 25 тыс. цэглін. Навучаньне аднаго рабочага летась каштавала станцыі прыблізна 75 р. Гэтыя вымушаныя страты станцыя робіць сьвядома. Беларусь павінна мець сваіх кваліфікаваных рабочых тарфянікаў.

Сушку торфу, як і кладку ў штабелі, робяць, галоўным чынам, жанчыны. Ёсьць нават спэцыяльны тэрмін „тарфушка“, які азначае жанчыну, што сушыць торф.

Тарфяныя пліткі, раскладзеныя з транспартара рабочымі на палёх для прасушкі, ляжаць пры добрым надвор'і ня больш сямі дзён. За гэты час „тарфушкі“ іх варочаюць, пасьля складаюць у «пяткі» (зорка з пяці цэглін) і, урэшце, у вялізныя клеткі па 50 цэглін. Апошняя работа—гэта складаньне ў штабелі. Штабель мае форму трапэцаідальнага кантаслупа, абхватам у 100 куб. мэтраў і зьмяшчае да 35 тысяч цэглін. У штабелях ужо гатовы торф, які можа ісьці на апал. Мы бачылі штабелі леташняе і сёлетняе пакладкі. Торф у штабелях не баіцца дажджу. Вада з яго сьцякае і не прамочвае цэглін. Цэгліны цьвёрдыя і нават цяжка рассякаюцца сякерою. Калі ўдарыць адну цэгліну аб другую, дык чуцен удар цьвёрдага дрэва.

Міханавіцкі торф як апал бадай лепшы ў Саюзе. Нізкі процант попельнасьці (каля 1 проц.) і высокае цеплатворная здольнасьць робяць яго апалам высокай якасьці.

(Канец будзе).

*) Гл. „СБ“ № 186(2675).

ЗАЛАТЫ ДОЖДЖ НА БАЛОЦЕ.

КУЛЬТУРА БАЛОТ АДКРЫВАЕ БАГАТЫЯ ПЭРСПЭКТЫВЫ ДЛЯ НАР. ГАСПАДАРКІ БССР

Балотная Дасьледчая Станцыя паказала на прыкладзе, што балоты даюць у шмат разоў большыя ўраджаі, чымся сёнешняе сялянскае поле.

* * *

Пры культуры балот 1 гэктар дасьць агульны прыбытак у 300 руб. У БССР 2 мільёны 600 тысяч гэктараў балот.

* * *

Пры дапамозе балот, тарфянымі кампостамі палепшым пяшчаныя глебы.

* * *

Павялічым на сотні мільёнаў рублёў нацыянальныя багацьці БССР—зробім ураджайнымі, залатымі нашы балоты.

УЗОРКА БАЛОТА ТРАКТАРАМ.

ВУЧОТ ЖЫТА.

Пераконаньні абываталя і рачаістасьць.

— Балоты Беларусі?! Ды якое гэта багацьце?.. Гэта нацыянальная бяда. Беларусь наогул стаіць пад пагрозай зьнішчэньня пошаснай хваробай—„Каўтуном“.

Так апавядала група абываталяў, трапіўшых з Беларусі ў Ленінград, ня так даўно, у мінулым годзе.

— Дасьледчая станцыя... Яна таксама не дае ніякай карысьці. Сваімі досьледамі на балоце яна пашырае гэту хваробу „Каўтун“... Верце нам, мы-ж вось толькі нядаўна з Беларусі...

Мімаволі ўспамінаецца гэта гутарка абываталяў, калі праходзіш каля Менскай Балотнай Дасьледчай Станцыі.

Непраходныя „камароўскія балоты“, калі хто іх ведаў 14 год таму назад, сталі зусім непадобнымі да балот.

Магістралі і асушыльныя канавы роўненькай істужкай адводзяць лішку вады з балота. Яны плянава раскінуты на сотнях гэктараў балот, адмяжоўваюць сабою дзялянкі высокаякасных пасеваў жыта, аўса, ячменю, пшаніцы, розных траў, гародніны і садавіны.

Шыракалістыя, з надзвычайна-вялікай колькасьцю зялёнай масы, авёс, падняўся высока—высока, вышэй чалавечага росту, абяцаючы даць сотні пудоў ураджаю зярна, на што няздатна зараз ніводнае сялянскае поле.

Мімаволі паўстае пытаньне: Дзе-ж гэты „Каўтун“, дзе дзелася гэта „нацыянальная хвароба“, дзе камар, той што можа ўзнагародзіць чалавека ліхаманкай, або інакш—«малярыяй». Дзе ўсё гэта?..

Абываталю, таму самаму, што маляваў перад незнаёмым чалавекам жудасную будучыню БССР, якую нясуць ёй балоты, гэтаму абываталю бязумоўна ня верыцца, што на балоце, замест гэтых хвароб, растуць найлепшыя аўсы, ячмені, пшаніца, жыта, гародніна, травы і інш.

Але ўсё гэта можна сваімі вачыма ўбачыць на дасьледчай балотнай станцыі пад самым Менскам.

Балоты робяць цуды.

Быў час, калі для беларускага селяніна балоты былі нічым іншым, як пяшчасьцем, але дасьледчая балотная станцыя сваей працай, сваімі досьледамі давяла адваротнае. Балотныя глебы, пры правільнай пастаноўцы працы, пры некаторай затраце сродкаў робяць нечаканыя цуды. Даюць сёньня ўраджаі асобных культур у шмат разоў большыя, чым любое сялянскае поле.

У Беларусі 2 мільёны 620 тысяч гэктараў балот. Гэтыя балоты павінны адыграць аграмадную ролю ў перабудове сельскай гаспадаркі ва ўсіх яе галінах наогул.

Беднасьць нашых палёў тлумачыцца толькі тым, што Беларусь у старыя часы была тэй пакінутай выспай, на якой сяляне і ня сьнілі пра агранамію, пра культурное вядзеньне гаспадаркі.

Вось чаму і яшчэ зараз нашы палі даюць надзвычайна малы ўраджай параўнаўча з некаторымі краінамі Захаду.

Вось лічбы, якія характарызуюць ураджайнасьць палёў у блізкіх да нас па кліматычных умовах краінах—Нямеччыны і Бэльгіі,—а таксама на Беларусі:

З 1 гэктару	Нямеччына	Бэльгія	Беларусь	Новыя Беларуск. землі-балоты
	У пудох			
Жыта	116	151	42,8	200
Аўса	124	162	50,8	240
Ячменю	132	185	45,4	200

Спрыяючыя кліматычныя ўмовы ў БССР параўнаўча нягоршыя, чым у Бэльгіі, або Нямеччыне, і мы, маючы ў наяўнасьці гэтыя ўласьцівасьці, маем мажлівасьць падвоіць і патроіць нашы ўраджаі, ці прасьцей—наш гэктар па ўраджайнасьці можа дагнаць і перагнаць ураджаі ў Бэльгіі і Нямеччыне. Трэба толькі да ўсіх тых мерапрыёмстваў і захадаў, якія праводзяцца партыяй і савецкім урадам, прыкласьці нашы творчыя здольнасьці. Творчая здольнасьць—уласьцівасьць працоўных, а прыкласьці яе ёсьць куды.

Згодна пяцігадовага пляну разьвіцьця нашай гаспадаркі, сельская гаспадарка павінна пайсьці далёка ўперад па шляху поўнай яе рэканструкцыі, па шляху інтэнсыфікацыі таварнасьці, машынізацыі, пераводу гаспадаркі на сацыялістычны шлях праз калектывізацыю яе і шэраг іншых мерапрыёмстваў.

Роля культуры балот у сельскай гаспадарцы

Сярод фактараў, якія зараз прыцягнуты да справы падвышэньня ўраджайнасьці, да падвышэньня вытворчасьці і павялічэньня таварнасьці нашых мінэральных глебаў надзвычайна вялікая роля прыпадае на долю мэліярацыі і культуры новых зямель—балот і забалочаных плошчаў.

У нас ёсьць вялікія абшары, занятыя балотамі, а таксама не малыя абшары занятыя пяскамі.

Балоты, маючыя прыродныя фактары, спрыяючыя ўраджайнасьці, дапамогуць таксама палепшыць, зрабіць прыгоднымі для добрых ураджаяў і пяскі—праз унясеньне ў пяшчаныя глебы торфу, які багаты мінэральнымі ўгнаеньнямі.

Нашы балоты, пераважна нізінныя, найбольш выгадныя для культывіроўкі выкарыстоўваюцца зараз у лепшай сваёй частцы як сенажаць, якая дае пудоў 60 самай благой асакі. Але гэтыя нязьмерныя плошчы, як давяла Менская балотная дасьледчая станцыя, могуць павялічыць нацыянальныя прыбыткі БССР на сотні мільёнаў рублёў у год.

Дасьледчая станцыя гэта падмацоўвае вынікамі шматгадовай працы, якую яна вяла на вялікім абшары камароўскіх балот. Аб працы яе мы зараз і пагаворым.

Менская Балотная Дасьледчая Станцыя.

Менская балотная дасьледчая станцыя Навукова Дасьледчага Інстытуту імя Ул. І. Леніна арганізавалася ў 1914 г., але праца яе не адпавядала поўнасьцю тым запатрабаваньням, якія вы-



САД НА БАЛОЦЕ.

соўваліся вялізарнейшымі абшарамі балот Беларусі. Толькі пасьля поўнага вызваленьня Беларусі ад розных акупантаў і банд дасьледчая станцыя разгарнула сваю дзейнасьць, увязаўшы ўсю сваю працу з агульным напрамкам эканамічнага разьвіцьця нашай краіны.

Станцыя паставіла на мэце знайсьці мэтады для гаспадарчага выкарыстоўваньня 2-х мільёнаў 600 з лішнім тысяч гэктараў балот і прыстасаваньня балот для рознага тыпу гаспадарак: саўгасаў, калгасаў і асобных гаспадарак.

Станцыя разгарнула працу ва ўсю шыр і праводзіць досьледы балот, якія маюць прыставаньне для ўсяе БССР і асобных яе частак, праз палявыя і лябараторныя досьледы.

У гэту вялікую справу станцыя ўцягнула вялікую колькасьць сялян дасьледчыкаў са ўсіх куткоў БССР.

Станцыя і зараз вывучае пытаньні культуры балот палявым і вегетацыйным спосабам, вывучае водны рэжым (ступень асушкі) для рознага тыпу балот; спосабы апрацоўкі балотных глебаў (мэханічны і конны); мэтады ўгнаеньняў (формы дозы і інш.), мэтады пасеву і дагляду за культурамі, севазвароты, вывучае кармовае пытаньне, што асабліва важна пры пераводзе нашай гаспадаркі з зернавой на больш прыбытковую—жывёлагадоўлю; вывучае гатункі зярновых культур, лугавых траў для балотнай глебы; вывучае мэтады павярхоўнага палепшэньня сенажацяў і выпасаў: вывучае эканоміку культуры балот у рознага тыпу гаспадарак (калектыўных, асобных і савгасаў); вывучае ўплыў культуры балот на палявую гаспадарку, у прыватнасьці—значэньне торфаўгнаеньня для пяшчанай глебы. І, урэшце, выконвае культур-тэхнічнае абсьледваньне балот, дае парады і тлумачэньні сялянам па культуры балот, часта дапамагаючы ў гэтым практычна.

Практычныя вынікі працы.

Пры наяўнасьці невялікай колькасьці працаўнікоў (параўнаўча з мінулым часам—з 1918 годам, колькасьць навукова-тэхнічных працаўнікоў павялічылася на сёньня з 2 да 18 (апрача рабочай сілы на полі). Станцыя ўжо сёньня можа даць дастатковую ў поўным сэнсе слова параду, як і за што ўзяцца пры культуры балот.

Вось яны практычныя парады ў выніку працы станцыі:

Балоты праз меру багаты неабходнай для расьлін вільгаці, лішак якой зьнішчаецца спосабам асушкі канавамі, ці дранажамі. Ва ўмовах Беларусі, найбольш выгадна праводзіць канавы для ўсіх галоўных палявых культур; на адлегласьці 3250 мэтраў адна ад другой, а дранажы—30-40 мэтраў адзін ад другога.

Узровень вады, які павінен застацца на балоце, патрэбен такі: для зернавых культур—60-80 сантым.; для лугавых траў—50-60 сант.; для тэхнічных культур (каноплі, лён)—70-80 сант.; для садовых—паўтара мэтры; для маліны—80 сант.

З якой расьліны найбольш выгадна распачынаць культуру балота?

Адным з найбольш важных пытаньняў у культуры балот зьяўляецца пытаньне з якой расьліны найбольш выгадна распачынаць гаспадарку на балоце. Балотная станцыя вывучыла ў дастатковай ступені і гэта пытаньне і аказалася, што першы год на балотах найбольш выгадна сеяць авёс, бульбу, віку з аўсом (аўсяная мешанка).

Грэчка на балоце зьяўляецца наогул культурай нявыгаднай, бо, пры наяўнасьці ў балотнай глебе вялікай колькасьці азоту, у грэчцы маюць найбольшае разьвіцьцё яе вегетацыйныя органы (зялёная маса) пры зусім малым ураджаі зярна (20 пудоў з гэктару).

Варта адзначыць і тую эканомію зярна пры пасеве, якая дасягнута станцыяй. Яна высявае на гэктар зямлі: аўса 90 кілёграм, жыта 120 кілёгр., ячменю—120 к-гр. У сялянскай-жа гаспадарцы на гэктар высяваецца: аўса—160 кіл-гр. і больш, ячменю—160 к-гр. і больш, жыта таксама—160 к-гр.

Пасеў станцыя робіць радавы талеркавай сеялкай (сашніковая няпрыгодна, бо забіваецца торфам).

Карняплоды таксама павінны быць на пэўнай адлегласьці адзін ад другога, толькі ў такім разе мажлівы добрыя ўраджаі.

Морква, напрыклад, высяваецца пры адлегласьці паміж радамі ў 30—40 сантымэтраў, а ў радзе—на адлегласьці каліва ад каліва ў 15—20 сант. Турнэпс і бручка—паміж радамі—60 сант., буракі—40-50 сант. Прычым найбольшы ўраджай і найбольшую эканамічную выгоду дае пасадка буракоў расадай.

Найлепшы час пасеву на балоце: для жыта—з 20 жніўня да 10 верасьня; позьні час пасеву дае значна меншы ўраджай; авёс—ад 25-га красавіка да 10-га мая; больш позьнія пасевы спрыяюць розным пашкоджаньням (іржаўчына, шведзкая муха), якія часам зьніжаюць ураджай ад 20 да 50 проц.; ячмень—ад 5 да 10 мая; бульбу станцыя садзіць ад 10 да 15-га мая. Садзіцца яна ня глыбей 10-ці сант., паміж радамі—50-60 сант. і ў радзе паміж калівамі—40-50 сант. (на дзесят. выходзіць 1500—1700 кіл-гр).

Аб угнаеньні.

Балотная станцыя выявіла, што беларускія нізінныя балоты адчуваюць нястачу ў фосфары і ў калію і багаты на самыя галоўныя і пры тым каштоўныя ўгнаеньні—азот і вапну. (Пуд азоту або салетры каштуе 4 рублі, супэрфасфату—70-80 кап. пуд, калійнай солі—90-95 кап.).

Балотная станцыя паказала, што ня ўносячы мінэральных угнаеньняў у балотную глебу, практыкаваньне на такой глебе любой культурны зусім нявыгадна. Станцыя зрабіла параўнаньне колькасьці патрэбных мінэральных угнаеньняў на нашых балотах з замежнымі. Выявілася, што нашы балоты патрабуюць унясеньня значна менш, чым балоты ў іншых краінах.

Найбольш выгадная доза ўгнаеньня для зернавых культур і лугавых траў—60 кілёграм фосфарнай кіслоты (або 24 пуды тамашлаку, ці такая-ж колькасьць супэрфасфату), 90 кілёгр. калія, або 15-18 пуд. калійнай солі.

Замежамі на гэтыя-ж культуры ўносіцца 100—130 кілёгр. фосфарнай кіслаты і 160 кілёграм калія.

Пад бульбу бывае выгадным павялічэньне калія да 160 кілёграм.

Вапна на нізінных балотах паніжае ўраджай, таму ўжываць яе станцыя ня раіць. Вапна зьніжае ураджай ад 18 да 37 проц. На махавых балотах прыкласьці вапны абавязкова, бо маховыя балоты бедны вапнаю.

Надзвычайна цікавы вынік досьледу станцыі над балотамі, якія знаходзяцца ў культуры: чым даўжэй балота знаходзіцца ў культуры, тым яно набывае большую вартасьць і дае большыя ўраджаі.

Станцыя выявіла таксама каштоўны ўплыў меднага купаросу на ўраджаі зернавых культур.

2[illegible] кілёгр. меднага купаросу павялічваюць ураджай ячменю да 60 проц. (1 гэктар бяз медн. куп. даў ураджай 127 пуд., а з медн. куп.—201 пуд., або каля трох ураджаяў з гэктару сялянскага поля).



КАНАВА НА БАЛОЦЕ.

Вось яны—цуды на балоце.

Сярод тысяч розных відаў і гатункаў культур на сельскай гаспадарцы станцыі, якая дапасоўвае ўсю сваю працу да агульнага напрамку нашай гаспадаркі, трэба было адабраць, адшукаць, а то і стварыць такія гатункі культур, якія найбольш выгадны для нашых балот. У выніку станцыя дасягнула гэтага, і балоты, якія ў вачох абываталяў здаюцца цечым страшным, адкуль пагроза каўтуна робіцца ўсё больш рэальнай, балоты якія ў вачох некаторых няўпэўненых, це перакананых сялян здаюцца адным „пяшчасьцем“,—гэтыя самыя „каўтуновыя, пяшчасныя“ балоты даюць такія ўраджаі, якімі ня можа ганарыцца ніводнае сялянскае поле.

Пачнём з гатункаў зярна, найбольш прыгодныя для балот, і ўраджайнасьці іх на балоце (лічбы аб ураджайнасьці ўзяты з ураджаю леташняга году).

Аўсы на зярно: „Залаты дождж“, выведзены на балотнай станцыі, дае 3629 кілёграм з гэктару; «Лігава»—1623 кіл. з гэктару; «Лейцевіцкі»—4232 кілёгр. з гэктару.

Аўсы для пакроўнай расьліны лугавых траў; „Німірчанскі“—4550 кіл. зярна з гэктару, «Залаты дождж», выведзены менскай балотнай станцыяй—3629 кіл. з гэкт.

Аўсы, для мешанак на сена: „Шацілаўскі“, «Победа», „Победитель“—кожны з іх дае ўраджай зялёнай масы да 12.000 кілёграм з гэкт.

Ячмяні: Найбольш трывалы ў беларускіх умовах—мясцовы ячмень. Таксама надзвычайна добрыя: „Брыо“, «Залаты» і „Чырвонец“—кожны з гэтых гатункаў дае ўраджай да 3200 кілёгр. з гэкт.

Жыта: «Вейбенскае» — ураджай 3000 кілёгр. з гэкт., „Пяткускае“—3600 кіл. з гэкт., «Вятка»—2970 кіл. з гэкт.

Апрача пералічаных гатункаў ёсьць і шэраг іншых, а ёсьць у такія гатункі, якія ў стадыі вывучэньня.

Між іншым, надзвычайна цікавая гісторыя з „Вейбенскім“ жытам. Гэта жыта адным з супрацоўнікаў у 1923 г. было прывезена з замежжа ў ліку 75 штук зёран, а ў гэтым годзе станцыя будзе мець ураджай гэтага жыта каля трох тысяч пудоў.

Карняплоды. Ураджай з гэктару і гатункі найбольш ураджайныя.

Турнэпс: „Грэйстон“—86.500 кіл., „Остэрзундэмскі“—82600, „Бортфэльскі“—79500 кілёгр., іншыя гатункі даюць ураджай 66.000 кілёгр.

Буракі кармовыя пры пасеве насеньнем даюць ураджай 32500 кілё (з гэктару), а пры пасеве расадай—76800 кілё.

Бручка кармавая «бангольнская» дае ўраджай з гэктару 36000 кіл. Морква кармавая—37800 кіл. з гэкт.

Станцыя мае на мэце давесьці таксама, што на беларускіх балотах з вялікім посьпехам можна разводзіць цукровыя буракі. Папярэднія вынікі 2-гадовага досьледу далі надзвычайна добрыя вынікі. Цукравітасьць буракоў была 16 проц. цукру; гэта цукравітасьць толькі на 2 проц. менш за цукравітасьць украінскіх, але затое ўраджай на балоце значна большы. На Украіне ўраджай буракоў з гэктару 900-1200 пуд., на балоце—2000 пудоў.

Бульба. Бульба на балоце дае надзвычайна вялікія ўраджаі. З позных гатункаў, як „сілезія“ ураджай з гэктару 27500 кілёгр., „вольтман“—23000 кіл.

З хуткасьпелых—„раньняя роза“. Ураджай—23000 кіл.

Тарфяныя глебы наогул спрыяюць для ўсіх сел.-гаспадарчых расьлін і асабліва для лугавых траў, карняплодаў і тэхнічных культур.

Такім чынам і тэхнічныя культуры з посьпехам могуць мець права на пашырэньне іх на культурах балот і даць вялікую колькасьць сырцу нашым заводам.

Каноплі, напрыклад, (мясцовыя вывучаны, а зараз вядзецца досьлед яшчэ над 10 гатункамі) даюць ураджай з гэктару 830 кіл. зярна і 600 кіл. пянькі. Такі ўраджай мясцовых канапель, бязумоўна, вельмі значны.

З другарадных палявых культур адзначым **проса**, якое на добра асушаных і перапрэлых тарфяніках дае ўраджай 1400 кілёгр. зярна і 5400 кілё саломы.

Гарох „соло“ (на такой самай глебе, як і проса) дае 1650 кіл. з гэкт. Мясцовы—таксама 1650 кілёгр. і зялёны, з Прымор'я—1900 кілёгр.

Гародніцтва на балоце.

Добра ўгноеныя і дагледжаныя гароды ня могуць спрачацца з балотамі на колькасьць ураджаю.

Капуста, напрыклад, дае ўраджай да 40000 кілёграм з гэктару.

З раньніх сартоў яе варта адзначыць: капусту № 1, „Вальвацэўку“ і „кашырку“, з позняй—«Браўншвэйская“.

Морква сталовая: «панская» і „валерыя“, якія даюць ураджай 26000 кілё з гэкт.

Бручка сталовая—40000 кілёгр. з гэкт.

Фасоль—найлепшы гатунак для балотнай глебы „спаржавыя“ (маскоўскай сэлекцыйнай станцыі). Ураджай 1700 кілёгр. з гэкт.

Боб звычайны—2060 кілёгр. з гэкт.

Урэшце, сталовыя буракі—32000 кілёгр. з гэкт.

Садоўніцтва на балотнай станцыі—яшчэ справа маладая, у стадыі вывучэньня. Маліны даюць 2100 кілёгр. буйных ягад з гэктару і клубніка—5200 кілё.

Лугаводзтва.

Балотныя глебы, з прычыны наяўнасьці ў іх даволі значнага проценту азоту і спрыяючых умоў вільготнасьці, зьяўляюцца надзвычайна прыгоднымі для ператварэньня іх у багацейшыя, высока-ўраджайныя сенажаці.

Кліматычныя ўмовы Беларусі, з перавагай анадзьдзяў на працягу вегетацыйнага пэрыяду над параваньнем і значнай хмарнасьцю неба, спрыяюць буйнаму росту вегетацыйных органаў расьлін (зялёнай масы).

Гэтыя факты кажуць за вялікія пэрспэктывы на Беларусі для разьвіцьця кармавога пытаньня, а значыць і для пашырэньня жывёлагадоўлі, на што і накіраваны крокі далейшага разьвіцьця нашай гаспадаркі. Таму станцыя і аддае максымум увагі пытаньню лугаводзтва на балотных глебах.

БАТАНІЧНЫ АНАЛІЗ СЕНА З РОЗНЫХ СЕНАЖАЦЯЎ

Станцыяй вывучаны цэлы шэраг лугавых траў для лугавых мешанак, вывучаны таксама спосабы пасеву лугавых траў.

Станцыя паказала, што найлепшай мешанкай для 3-4-х гадовага карыстаньня зьяўляецца мешанка, складзеная з Цімафееўкі—10 кілёгр., Швэцкай канюшыны—6 кіл., Чырвонай канюшыны—6 кілё.

Гэта мешанка дае ў 2-м годзе 11200 кілёграм ураджаю (700 пуд.) з гэт.

Ва ўмовах Беларусі для шматгадовых (6-8 год) мешанак найлепшай аказалася наступная: купкоўкі—5 кілё, мурожніцы лугавой—5 кілё, цімафееўкі—20 кілё, канюшыны чырвонай—3 кілё, канюшыны швэцкай—7 кілё. Ураджай з гэктару—660 пуд.

З лугавыпасных мешанак—найлепшая наступная: цімафееўкі—2 кілё, мурожніцы лугавой—2 кілё, мятлюга—5,5 кілё, купкоўкі—2 кілё, канюшыны чырвонай—6 кілё, канюшына швэцкай—6 кілё, канюшыны белай—6 кілё.

Гэта мешанка косіцца ў працягу 2-3 год, а потым на 5-6 год ідзе для папасу.

Станцыяй выяўлена, што нормы высеву лугавых траў даюць найбольшы эфэкт тады, калі яны высяюцца на 25 проц. менш, чым тая норма, якая прынята ў Зах. Эўропе і ў нас у некаторых мясцох. Гэта зьмяншэньне высеву падвышае ўраджай ад 38 да 80 проц.

Выяўлена таксама, што найлепшай папярэдняй культурай перад залучэньнем сенажацяў на балоце зьяўляецца бульба, трава „Райгас“ і авёс.

Высяваць лугавыя мешанкі можна як у чыстым выглядзе, так і з пакроўнай расьлінай; для гэтага найлепш прыгодны авёс Немерчанскі і «Залаты дождж» балотнай станцыі.

Найбольш выгаднымі травамі на пасеньне зьяўляецца Цімафееўка, Рэйграз, Вэсьцервульдзкі і Мурожніца лугавая. Ураджай зярна іх паасобку з гэктару ад 800 да 1200 кілё.

Надзвычайна важны і такі вынік досьледу станцыі, як пытаньне павярхоўнага палепшаньня балотных сенажацяў.

Павярхоўнае палепшаньне, як пераходная ступень да інтэнсіўнай культуры, можа з посьпехам практыкавацца і даць значныя прыбыткі гаспадарцы пры асушцы канавамі на адлегласьці 200 мэтраў адна ад другой. У выпадку-ж угнаеньня супэрфасфатам (ці тамашлакам) і калійнай сольлю ўраджайнасьць сенажаці павялічыцца ў 4 разы.

Уплыў на пяшчаную глебу.

Пяшчаныя глебы, тыя самыя, якія сапраўды зьяўляюцца няшчасьцем у гаспадарцы і даюць самыя бедныя ўраджаі, або зусім нічога ня робяць, пры дапамозе балот, як выявіла станцыя, таксама могуць быць надзвычайна карыснымі і ўраджайнымі. Пасьля ўгнаеньня пяшчанай глебы торфам (тарфяным кампостам) зусім лёгка атрымаць з гэктару замест 500 кілёграмаў—2500 кіл. жыта, а таксама і іншых расьлін.

Праводзячы вывучэньне розных спосабаў культуры балот, станцыя паказала, што насыпны спосаб—торф зьмешаны з пяском, торф зьмешаны з глінай дае некалькі больш тэхнічны эфэкт, але з прычыны дарагоўлі ва ўмовах эканамічна нявыгадны. Спосабам найбольш выгадным зьяўляецца звычайны чорны спосаб. Вось яна коратка частка галоўных вынікаў, тэй карыскай і плённай працы, якую прарабіла за нязначны пэрыяд часу першая ва ўсім СССР і другая ў сьвеце Менская дасьледчая балотная станцыя. Яна сваёй працай намалявала вялікую будучыню беларускіх балот, і не здарма станцыя за гэту руплівую, неаслабную працу ва ўсе часы жыцьця Беларусі Савецкім Урадам узнагароджона ордэнам працоўнага Чырвонага Сьцягу.

Апрача гэтай працы, якая прароблена станцыяй, ёю праведзена шэраг курсаў, праведзена і праводзіцца падрыхтоўка спэцыялістых для кіраўніцтва культуртэхнічнай працай у акругах. Яна рыхтуе вучоных—праводзіць навуковую працу з асьпірантамі; выпусьціла шэраг навуковай літаратуры.

Станцыя праводзіць шырокую дасьледчую працу праз сялян-дасьледчыкаў, правяла шэраг выставак, арганізавала дзесяткі музэяў, прачытала сотні лекцый і дакладаў, выяжджае ў савгасы і колектывы для кансультацыі.

За апошнія 5 год станцыю наведала 17000 сялян з далёкіх і глухіх куткоў Савецкай Беларусі, РСФСР, Украіны і іншых рэспублік.

У 30-м годзе на Менскую балотную станцыю прыяжджае для азнаямленьня сусьветны кангрэс вучоных балотазнаўцаў, а таксама тут адбудзецца ўсесаюзны зьезд балотазнаўцаў і лугазнаўцаў.

Цяжкасьці ў працы.

Ня гледзячы на тое, што Менская балотная станцыя, аб якой у свой час (у пачатку 20 гадоў) надзвычайна добра адгукаўся т. Ул. Ленін станцыя, якая мае ўсесаюзнае і сусьветнае значэньне, усё-ж ня мае тых грашовых мажлівасьцяй, якія забясьпечылі-б ёй шпаркі тэмп разгортваньня важнай для нашай народнай гаспадаркі дасьледчай справы. Нашы грашовыя органы адпусьцілі станцыі 37000 рублёў на год, у той час, як, напрыклад, Саратаўская станцыя ў РСФСР, маючая абласное значэньне, атрымлівае паўмільёна руб.

Станцыя за 10 год працы мае надзвычайна многа каштоўных для гаспадаркі практычных вынікаў, якія за адсутнасьцю сродкаў марнуюцца, ня друкуюцца і такім чынам застаюцца ня масавым пераймальнем, а голымі дасьледчымі фактамі. Для гэтай справы патрэбна, апроча брашуры, і часапіс, якая калісьці выдавалася станцыяй.

Шмат матар'ялаў мае станцыя, вялізарнейшую колькасьць узораў вынікаў, якія з-за атсутнасьці спэцыяльнага памяшканьня ляжаць на адчыненым паветры і ствараюць цяжкасьці для працы навуковых працаўнікоў.

Малы вегетацыйны павільён зусім нездавальняе запатрабаваньняў. Неабходна пабудова новага павільёну (і зноў сродкі), неабходна даабсталяваньне хімічнай лябараторыі, патрэбна пабудова лябараторыі—для вывучэньня біолёгічнай мочкі тэхнічных культур, апрацоўкі іх і вывучэньня якасьці валакна. Тут патрэбна ўвага ВСНГБ, у распаражэньні якога ўсе фабрыкі і заводы і якія павінен быць зацікаўленым справай пашырэньня тэхнічных культур.

Мы лічым таксама, што Белдзяржкіно можа знайсьці надзвычайна багаты матар'ял на дасьледчай станцыі, каб паказаць нашаму селяніну сапраўдную прыгоднасьць балота.

Увага балоту.

Сродкі, затрачаныя на дасьледчую справу, будуць вернуты краіне вельмі хутка, бо апрацоўка 2.600.000 гэктараў балот павяліча балянс нацыянальных багацьцяў Беларусі на сотні мільёнаў.

Гэты, кароткі нарыс аб практычнай працы дасьледчай станцыі паказаў, наколькі памылковы разважацьні аб балотах, а таксама шкодную хлусьню нашых ворагаў і самых звычайных абываталяў пра „каўтун“ і „жудасную будучыню БССР“.

Станцыя вывела новыя гатункі расьлін, яна атрымала добрыя вынікі па скрыжаваньню жыта з пшаніцай (вопыты з жытня-пшанічным гібрыдам), гэта праца ў выніку дасьць трывалае для беларускіх умоў зярно на белую палепшаную муку.

Балоты перакапалі ў тым, што, замест каўтуна, яны здольны даць сотні пудоў ураджаю зярна, сена і тысячы пудоў карняплодаў, што яны здольны радзіць на гэктары, за адзін год столькі, колькі ў сёньняшняй сялянскай гаспадарцы родзіць 30 гэктараў, або колькі 1 гэктар родзіць у працягу 30-ці год.

Пэратворым мільёны гэктараў закінутых, дзікіх балот у багацейшыя жытніцы!

Ул. Паскрэбка.

Да пабудовы ў БССР кіно-фабрыкі.

Дзе будзе пабудавана кіно-фабрыка?

(Гутарка з нам. дырэктара Белдзяржкіно тав. Матусавым).

Згодна рашэнню СНК Беларусі аб пабудовы кіно-фабрыкі Белдзяржкіно зараз вывучае пытаньне аб месцы для фабрыкі.

Па думцы Белдзяржкіно месца пабудовы можа быць абрана ў Гомелю, Віцебску і Менску.

Пры абраньі месца пабудовы трэба выходзіць з наступных матываў: тэрыторыя, прыродныя асаблівасьці, сувязь з горадам і г. д. Грунтуючыся на ўсе вышэйазначаныя асаблівасьці мы павінны абраць месца пабудовы.

Акруговыя выканаўчыя камітэты лічаць, што лепш усяго на тэрыторыю іхняй акругі будаваць ф-ку. Нам зараз цікава высьветліць думку ўсёй грамадзкасьці аб ф-цы. Мы бясспрэчна не павінны лічыцца „патрыятызмам" асобных акруг.

Менск, як культурны цэнтр—мае асабліва права на пабудову фабрыкі.

— Новая фабрыка—кажа далей т. Матусаў—абыйдзецца ў 2 з пал. млн. руб. Зараз намі вывучаюцца пляны кіно-фабрык саюзных рэспублік(совкіно, ВУФКУ). Ф-ку мяркуецца будаваць па прынцыпу ўнаўбудуючайся ў Маскве вялікай кіно-фабрыкі. Трэба лічыць, што наша беларуская фабрыка будзе ня ніжэй тэхнічна абарудавана саюзных кіно-фабрык.

Ф-ка прадугледжвае да выпуску ў год ня менш 20 мастацкіх і 50 культурных фільмаў. Згодна нашага пляну і рашэньні СНК пабудова фабрыкі будзе зусім скончана праз 2-3 гады.

На ф-цы будуць працаваць каля 400 чалавек. Па сканчэньні пабудовы ўвесь інвэнтар Ленінградскай ф-кі будзе праведзен у Беларусі.

М.

Менскі АВК аб кіно-фабрыцы.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыума АВК т. Галкін зрабіў паведамленьне аб пабудовы кіно-фабрыкі.

Прэзыдыум прапанаваў Белдзяржкіно зрабіць інфармацыю на пленуме гарсавета аб новай ф-цы і навокал гэтага пытаньня стварыць грамадзкую думку.

Менскаму Гарсавету разам з Белдзяржкіно прапанавана падшукаць вучастак зямлі для пабудовы ф-кі.

Пытаньне, дзе будаваць ф-ку будзе шырока абгаворана сярод працоўных.

Трэба больш энэргічна рыхтавацца да 1-й Усебеларускай выстаўкі сельскай гасп. і прамысловасьці

(У парадку абґаварэньня).

Прайшло ўжо некалькі месяцаў, як была дадзена дырэктыва рыхтавацца да выстаўкі, але да гэтага часу, у гэтым напрамку, як у акруговым маштабе, так і на мясцох робіцца вельмі і вельмі мала. Як відаць ня ўсе дастаткова разумеюць ідзі выстаўкі,—калі загаворыць аб выстаўцы, дык галоўным чынам маюць на ўвазе два аддзелы акрвыканкома—зямельны і аддзел мясцовай прамысловасьці. Але ў сапраўднасьці, памойму, гэта ня так. Да выстаўкі павінны рыхтавацца ўсе аддзелы і інспэктуры акрвыканкому, бо выстаўка мае сваей мэтай паказаць на справе тыя дасягненьні, якія мы будзем мець да жніўня 1930 г.

Выстаўка пакажа, што зроблена ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва за пройдзены этап пяцігодкі пакажа і тыя пэрспэктывы і магчымасьці, якія гарантыруюць выкананьне ўсёй пяцігодкі, бо пяцігодка ахоплівае ўсе артэрыі нашага сацыялістычнага будаўніцтва. На выстаўцы павінна быць прадстаўлена некалькі пэрыядаў — даваенны, пэрыяд імпэрыялістычнай і грамадзкай вайны, пэрыяд аднаўленьня народнай гаспадаркі, пэрыяд пераходу на сацыялістычнае будаўніцтва і пэрыяд бліжэйшых пэрспэктыў да канца пяцігодкі.

Калі карысна паглядзець на выстаўцы вынікі разгортванья гіганцкімі крокамі нашай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі на сацыялістычных пачатках, то ня менш цікава ўбачыць на выстаўцы, як ідзе развіцьцё нашага дзяржгандлю за кошт зварачваньня прыватнага гандлю, што павінна быць прадстаўлена нашай інспэктурай дзяржгандлю і каапэрацыяй.

Інспэктура працы, прафсаюзы, інспэкцыя сацыяльнага забясьпечаньня, камітэт узаемадапамогі—павінны паказаць на выстаўцы, як ідзе рост дабрабыту гарадзкога рабочага, у якой ступені ідзе расслаеньне вёскі.

Акрана на выстаўцы павінен прадэманстраваць, якімі шпаркімі крокамі мы набліжаемся да ажыцьцяўленьня агульнага абучэньня і ліквідацыі няпісьменнасьці.

Інспэктура аховы здароўя павінна прадставіць на выстаўцы, як ідзе аздараўленьне пралетарыяту і працоўнага сялянства.

Адным словам, усе аддзелы і інспэктуры, яшчэ прымаюць у роўнай меры ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, павінны ўсе як адзін прадэманстраваць на ўсебеларускай выстаўцы нашу эканамічную, сацыяльную, выхаваўчую, культурна-бытавую моц. Для гэтага неабходна зараз-жа, згодна пастановы акрвыстаўкому, усім аддзелам і інспэктурам сур'ёзна заняцца гэтай справай. Трэба вылучыць у кожным аддзеле і інспэктуры адпаведнага працаўніка, які добра знаёмы з жыцьцём, дзейнасьцю, пэрспэктывай разьвіцця свайго аддзелу і інспэктуры і ўзлажыць на яго гэту працу па падрыхтоўцы.

Я не хачу сказаць, што толькі гэтая асоба павінна займацца падрыхтоўкай. Падрыхтоўкай павінны займацца ўсе аддзелы і інспэктуры, а вылучаная асоба зьвязіцца толькі канцэнтратарам гэтай справы. Далей, акрвыстаўкому трэба зараз-жа зьвярнуцца да галоўвыстаўкому за атрыманьнем лімітаў, крыніц і разьмераў фінансіраваньня па ўсім галінам, якія павінны быць прадстаўлены на выстаўцы і ўсё гэта разаслаць зараз-жа па райёнам. У працоўным выпадку можа здарыцца, што шмат будзе ўпушчана, а некаторыя аддзелы, у прыватнасьці зямельны можа страціць усякую магчымасьць да падрыхтоўкі, значная частка экспанатаў для выстаўкі павінна быць узята з ураджаю 1929 г., бо многія экспанаты з ураджаю 1930 г. да жніўня месяцу яшчэ ня высьпеюць (ярына, гародніна, садавіна і інш).

Менская акруга. Вэтурач Катляр.

ХРОНІКА.

АДЧЫНІЛАСЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ СПАРТАКІАДА СЯЛЯНСКІХ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ.

Учора а 9-ай гадзіне ўвечары ў памяшканьні Дому Селяніна адбылося ўрачыстае адчыненьне Усебеларускай сялянскай спартакіяды.

— Спартакіяда—кажа адчыняючы вечар ст. ВСФКБ т. Рыжоў—павінна навучыць нас, як трэба працаваць на фізкультурным фронце, як фізкультурна-бадзёрым пралетарыям трэба будаваць сваю сацыялістычную бацькаўшчыну.

Фізкультурныя шэрагі трэба яшчэ больш запоўніць працоўным сялянствам і батракамі.

З прывітаньнем ад імя ЦВК Беларусі выступіў т. Дубакоў.

Ад імя французкіх фізкультурнікаў і спортінтэрну ўдзельнікаў спартакіяды вітаў т. Рэнэ Русо.

Падрыхтоўка да „Дню калектывізацыі".

ЦК к-таў сялянскай узаемадапамогі даў дырэктыву ўсім КСТУ аб сваечасовай падрыхтоўцы да дню калектывізацыі. Усе КСТУ павінны вызначыць сродкі на оправу калектывізацыі, шырока разгарнуць спаборніцтва на спраўневшую арганізацыю калгасаў, за поўнае правядзеньне аграмінімуму.

* * *

Калгассаюз Гомельшчыны зьвярнуўся з заклікам да ўсіх калгасаў акругі распачаць падрыхтоўку да правядзеньня „Дню Калектывізацыі" з тым, каб ляпей яго адзначыць.

У сваім лісьце Калгассаюз рэкамэндуе калгасам наладзіць таварыскія гутаркі з сялянамі, на якіх расказаць, як яны будавалі сваю калгасную гаспадарку, як перамагалі цяжкасьці, як яны дамагліся падвышэньня ўраджайнасьці і г. д. У дзень калектывізацыі наладзіць экскурсію сялян у бліжэйшыя калгасы, дзе яны на справе ўбачаць дасягненьні калектыўнай працы.

Калгасы павінны правесьці падпіску сродкаў сваіх членаў на 3-ю пазыку і арганізаваць збор сродкаў у фонд калектывізацыі. Прыняць захады да таго, каб да 28-га жніўня окончыць уборку і абмалот ураджаю і ў дзень калектывізацыі здаць усе лішкі хлеба загатоўчым арганізацыям.

Адначасова з гэтым калгасьнікі павінны актыўна ўдзельнічаць у арганізацыі калгасаў і розных сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў.

Прафсаюзы падпісваюцца на 3-ю пазыку

Агульная сума падпіскі на 3-ю пазыку індустрыялізацыі па саюзу транспартнікаў дасягнула 35.505 руб., што складае 91,8 проц. заробнай платы сяброў саюзу.

* * *

Падпіска па сувязі перасягнула 37 тысяч рублёў; рабочыя і служачыя Менскай п.-т. канторы падпісаліся на 28500 рублёў.

Сябры саюзу Нархач падпісаліся на 35276 рублёў. Хатнія працаўніцы Менску падпісаліся на 2825 руб.

* * *

Падпіска па прадпрыемствах с. хімікаў дасягнула наступных лічбаў: завод „Ноўка"—1800 руб., завод „Камінтэрн"—5675 р., „Чырвоны Хімік"—8685 руб., „Бярэзіна"—43 тысячы.

Служачыя шклотрэсту падпісаліся на 4200 рублёў.

Творы Леніна—у масы камсамольцаў.

Бюро Менскага Акруговага камітэту камсамолу пастанавіў растаўсодзіць сярод комсамольцаў Меншчыны 10 тысяч тамоў выданьня твораў Леніна на беларускай мове.

Па ячэйках пачалася падрыхтоўчая праца да правядзеньня кампаніі.

Прыезд прадстаўніка спорт-інтэрну.

Учора ў Менск прыехаў з Парыжу прадстаўнік спортінтэрну і французскай спартыўнай сэкцыі т. Рэнэ-Руссо.

Тав. Рэнэ-Руссо прыме ўдзел у працы Усебеларускай вясковай спартакіядзе.

Трохмесячнік беларускай культуры.

ЦК ЛКСМБ пастанавіў з лістапада м-ца пачаць 3-хмесячнік беларускай культуры.

Мэта 3-х месячніка—яшчэ больш вывучыць організацыю нацыянальнай палітыкі партыі і яе ажыцьцяўленьня.

Да 3-хмесячніку будуць прыцягнуты грамадзкія і дзяржаўныя арганізацыі.

Распачынаецца будаўніцтва памяшканьня БАН.

Па Барысаўскаму тракту, за універсытэцкімі клінікамі ў бліжэйшыя гады разгорнецца шырокае будаўніцтва памяшканьняў над БАН, інстытуту прамысловасьці, дасьледчага інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі.

Будаўніцтва памяшканьняў БАН мае распачацца яшчэ сёлета. Пад усе інстытуты БАН адводзіцца 25 гэкт. Тут мае быць арганізаваны батанічны сад на 15 гэкт., зоалёгічны парк і інш. Гэтымі днямі прыступаюць да абвяшчэньня конкурсу на лепшы праэкт.

Дзяржплян зацьвердзіў каштарыс на будаўніцтва БАН на першы год у суме 200.000 руб. Прадугледзіўшы пры гэтым значнае папырэньне будаўнічых работ, якія могуць выйсьці з межаў вызначаных лічбы.

Электрычная лінія да пабудовы с.-г. выстаўкі.

Прэзыдыум Менскага АВК уключыў у аб'екты капітальнага будаўніцтва на 1928-29 год правядзеньне электрычнай лініі на ўсебеларускую сельска-гаспадарчую выстаўку.

Вядзецца падрыхтоўчая праца.

Да перавыбараў камітэтаў страхкас.

У сувязі з правядзеньнем кампаніі перавыбараў страхавых камітэтаў ЦСПСБ зьвярнуўся з лістом да усіх профарганізацый дзе завострана ўвага ўсёй грамадзкасьці на неабходнасьці актыўнага ўдзелу ў перавыбарах ФЗМК даручана шырока абгаварыць гэтае пытаньне на агульных сходах рабочых і служачых.

Конкурс на лепшую п'есу працягнут.

Згодна рашэньня журы па правядзеньні конкурсу на лепшую п'есу для клюбнай і вясковай сцэны—конкурс працягнут да 1-га верасьня,

З пастуліўшых п'ес пакуль ніводная на справе ўбачаць дасягненьні калектыўнай працы.

У БДТ-2.

З 9 жніўня БДТ-2 прыступае к падрыхтоўчай працы да новага сэзону. Тэатр будзе працаваць да сакавіка ў Віцебску, пасьля чаго пераяджае ў Менск. У сучасны момант падрыхтоўваецца музыкальная п'еса Заянцкоўскага „Простые сэрца".

У Т-ве прыхільнікаў дзяцей.

Таварыствам прыхільнікаў дзяцей адпушчана 700 рублёў у дапамогу дзецям беднаты. Грошы разьмяркоўваюцца сярод сірот на вопратку, кнігі і г. д.

* * *

Зараз таварыствам вядзецца праца па адчыненьню ў Менску заводу па апрацоўкі фруктаў.

На завод будуць накіроўвацца выключна биспрытульныя.

Мэханізацыя пагрузачных работ.

Прэзыдыум Саюзу транспартнікаў заслухаў даклад аб 5-цігадовым пляне савгандльфлёту.

— Па Беларусі прадугледжваецца павялічэньне грузаабароту на 73 проц.

На існуючых шляхох будуць установлены 35 машын для мэханізацыі пагрузачных прац. Заробная плата рабочых будзе павялічана на 20 проц.

Саюзам унесены шэраг дадаткаў да пляну.

Лесаўпарадкаваньне БССР.

У сёлетнім годзе па ўсіх акругах БССР працуюць 43 лесаўпарадкаваўчыя партыі, у складзе якіх знаходзяцца 370 лесаўпарадкавацеляў. Намечаныя на пляну працы будуць скончаны ў лістападзе бягучага году. Пасьля гэтага ў рысавальнях будуць апрацоўвацца сабраныя лесаўпарадкавацелямі матар'ялы.

Праца лесаўпарадкаваньня, галоўным чынам ідзе ў напрамку адмежаваньня ляснога фонду ад зямель сельска-гаспадарчага прызначэньня.

Звыш 500 зернаачышчальных машын гатовы.

У сучасны момант усе КСТ'у ужо падрыхтаваліся да зернаачышчэньня. На прыкатных пунктах к-тэтаў будуць працаваць у часе васеньняй сяўбы звыш 500 зернаачышчальных машын.

Фізкультура на мясцох

(Гутарка з Бабруйскім прадстаўніком на ўсебеларускую сялянскую спартакіяду).

Сетка фізкультурных арганізацый на мясцох пашырана недастаткова з прычыны недахопу інструктароў фізкультуры.

У мяст. Сьвіслач фізкультурны гурток запрацаваў толькі нядаўна—ня было інструктара. Моладзь фізкультурай вельмі цікавіцца, але трэба адзначыць, што да гэтае пары жанчыны не асвоіліся з думкай аб спартыўных трусіках і ў гурткі ня ідуць. Райённыя партарганізацыі праявілі вялікую зацікаўленасьць да ахапленьня вясковай моладзі гурткамі. Гурткі, у тых мясцох, дзе яны існуюць, правадзяць працу папулярызацыі палітыкі партыі і сав. улады. У гэтай галіне вялікую ролю адыгрываюць гарадзкія фізкультурныя гурткі. Яны прымаюць шэфства над вясковымі гуркамі, уцягваюць у іх моладзь з савгасаў і калгасаў. Гарадзкімі гурткамі ф-ры таксама праводзіцца вялікая праца па інтэрнацыянальным выхаваньню вясковай моладзі. Адным словам, вёска не адстае, толькі трэба, каб горад дапамог ёй ісьці па культурнаму шляху.

Б. Міх.

Часова выкон. абавязкі адказнага рэдактара П. ШАСТАКОЎ.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
ГАСТРОЛІ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ
Нядзеля, 18-га жніўня
ПРЭМ'ЕРА
„ЦЫГАНСКАЯ ЛЮБОВЬ" у 3 дзеях Легары.
ПАЧАТАК А 8 з пал. ГАДЗІНЕ.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА", МАСТАЦКІ ФІЛЬМ „НАВАЛЬНІЦА". 3 аўторка, 13 жніўня. У 6 частках. Звыш праграмы: КІНО-ХРОНІКА № 37.

КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71. З 13 жніўня. Вялікі мастацкі гістарыч. баявік з эпохі панаваньня Паўла I. „ЗАЛАТАЯ ДЗЮБА". Штодня 2 сэансы, пачатак: 1-га—9 г. 15 х. 2-га—10 г. 45 х. Каса а 7 гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». Выключны мастацкі баявік па аповесьці „Бурлачка" Нягуялевіцкага. „ВАСІЛІНА". Драма ў 6 частках. Звыш праграмы: Хроніка Белдзяржкіно № 18.

1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПРАЛЕТАРЫ" „АДРАС ЛЕНІНА" Штодня 2 сэансы: у 3 з паловай і 5 гадзін. Каса—ад 2-х гадз. Па нядзелях ад 12 г. дню.

АД ВАЛЮТНАЙ УПРАВЫ НКФ БССР.

20, 21 і 22 жніўня г.г. у г. Арцёмаўску (УССР) адбудзецца:

8-МЫ ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ

ДЗЯРЖАЎНАЙ УНУТРАНАЙ ВЫЙГРЫШНАЙ 1-Й ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ і народнай гаспадаркі СССР.

У гэтым тыражы будзе разыграна: 20.050 выйгрышаў па 100 руб., 3.150 выйгрыш. па 250 руб., 84 выйгр. па 1.000 руб., 10 выйгр. па 5.000 руб., 5 выйгр. па 10.000 руб. і 1 выйгрыш у 25.000 руб., усяго 23.300 выйгрышаў на суму 3.001.500 рублёў.

Выйграўшая аблігацыя пагашаецца і ня ўдзельнічае ў далейшых тыражох. Апроч выйгрышу, трымацелю выйграўшай аблігацыі выплачваецца намінальны кошт аблігацыі, а таксама праценты па бягучаму купону да дню тыражу. Выплата выйграшаў праводзіцца на агульных падставах. Афіцыйная табліца выйгрышаў будзе зьмешчана ў газэце „Известия ЦИК СССР и ВЦИК".

АБВЕСТКА.

У разьвіцьцё абавязковай пастановы № 31, Менкамгас абвяшчае сьпісак домаўладаньняў, падлягаючых абавязковаму каналізаваньню ў 1929-30 г.

На вул. **Валадарскага** домаўладаньні:
2, 4, 5, 7, 9, 10, 11, 16, 17, 19, 20/7, 21, 23, 23/9, 26, 28, 30/5.

На вул. **Карла Маркса** домаўладаньні:
1/15, 3, 4, 5, 9/23, 10, 11/8, 12, 13, 14, 15, 17, 19, 20, 21/49, 22/46, 23, 26, 27, 28, 29, 30, 31/44, 32, 33, 34, 35, 36/38, 37, 38/23, 40, 41, 42, 44/42, 48/1, 50, 54, 55/1, 56а/.

На **Камуністычнай вул.** домаўладаньні,
1/7, 2/9, 4, 5, 6, 7, 8, 12, 13, 14/12, 16/11, 17, 18, 19, 20, 21, 23, 26, 28/2, 29/7, 33, 38, 40, 42.

На **Камсамольскай вул.** домаўладаньні:
1/43, 2/15, 4, 5, 6, 7, 8, 10/16, 11/7, 12/9, 13, 14, 15, 16, 17/10, 18, 20, 20/12, 21, 22/13, 23, 24, 25, 26, 28, 32, 38, 39, 40, 42, 44/31.

На **Чырвонаармейскай вул.** домаўладаньні:
1/94, 2/50, 3, 7/52, 10, 11/44, 14, 15/2, 17, 21/2.

На **Ленінскай вул.** домаўладаньні:
29/35, 31/26, 40, 42, 46/33, 48/24, 52, 54.

На **Інтэрнацыянальнай вул.** домаўладаньні:
1/2, 2/11, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10/17, 11, 12/20, 13/22, 14, 15, 16, 17, 18, 19, 21, 23, 25, 26/1, 27, 28, 29, 30, 31, 32, 33/1, 34.

На **Кастрычнікавай вул.** домаўладаньні:
1/3, 2/12, 3, 4, 5, 6, 7/1, 8, 10, 12, 13, 15, 17, 19/21, 26, 30.

На **Пл. Волі** домаўладаньні:
1/2, 1/4, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11/2, 12, 13, 14, 15, 17, 21/1, 23/2, 25/1, 27/2, 29, 31/1, 33/2,

На **вул. Бакуніна** домаўладаньні:
1, 1/43, 37, 39.

На **Пралетарскай вул.** домаўладаньні:
1/55, 2, 4, 6/100, 7/98, 9/107, 13/46, 15/39, 16.

На **Пралетарскай набэражнай** домаўладаньні:
4/48, 6, 10/12, 16, 18/11.

На **Першамайскай вул.** домаўладаньні:
2/21, 3, 4, 6, 7, 8, 10, 11/18.

На **Рэвалюцыйнай вул.** домаўладаньні:
1/21, 2/23, 3, 4, 6, 7/11, 8, 9/12, 10, 11, 11/а, 12, 13, 15, 17, 17/6, 19, 20, 21, 22, 23, 24, 25/6, 26, 28, 30, 32/8.

На **Савецкай вул.** домаўладаньні:
4, 8, 9, 10, 14, 16, 18, 24, 25, 28, 31/2, 32/1, 34, 36.

На **Універсытэцкай вул.** домаўладаньні:
1/21, 4, 5/30, 8/18, 12, 16, 22/1, 24/48, 25, 27, 28/31, 29, 30, 31, 32, 33/46, 35/29, 37, 38, 40, 41, 42/8, 43/27, 44/11, 45, 46, 47, 48, 48/4.

На **вул. Урыцкага** домаўладаньні:
2, 3, 4, 4/а, 5, 6, 7, 8/11, 9, 11/13.

На **вул. Энгельса** домаўладаньні:
2, 3/1, 4/1, 6, 7, 8, 9/10, 11/16, 12/14, 13, 14, 15, 16, 17, 18, 20, 21/49, 22, 25, 26/92, 27/43, 28, 30/47, 31, 32/42, 33, 34, 36/41, 39, 42, 43, 44, 46, 48, 50, 56.

Каштоўнасьць прылучэньня аднэй кватэры, складаючагася з прыбіральні і ракавіны, арыентыровачна трэба лічыць 750 руб. Усім вышэйпералічаным уладаньням неабходна, з пачатку будаўнічага сэзону накапіцца знаходжэньнем сродкаў для спаўненьня работ і складаньне праэктаў. Праэкты ўстройства дамовай каналізацыі зацьвярджаюцца камісіяй пры камгасе.

Загадчык камгасам ДЗІЧКОЎСКІ.
За заг. каналіз. кіраўнік.-тэхнік ПЯТКЕВІЧ.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

Менскага Сельска-Гаспадарчага-Прамысловага Камбінату „МЕНСЕЛЬПРОМ".

На 1-га кастрычніка 1928 году.

АКТЫЎ.			ПАСЫЎ.		
I. МАЕМАСЬЦЬ:			**I. КАПІТАЛЫ:**		
1. Будынкі і сааружэньні	735218—61		1. Устаўны	1257582—32	
2. Абсталяваньне і машыны	268663—32		2. Амартызацыйны	98231—09	
3. Інвэнтар	129197—76		3. Рэзэрвовы	13653—50	1369466—91
4. Транспарт	60169—24		**II. ФОНДЫ:**		
5. Мэліарацыя і садовыя насаджэньні	23483—16	1216732—09	1. Фонд прадстаячых выдаткаў		1691—38
II. Няскончаныя пабудовы		66576—46	**III. РЭЗЭРВЫ:**		
III. Няскончаны капітальны рамонт		45602—80	Рэзэрв няпэўных даўгоў		26275—50
IV. МАТАР'ЯЛЫ:			**IV. БЮДЖЭТНАЕ ФІНАНСАВАНЬНЕ:**		
1. Сыравіна і асноўныя матар'ялы	42920—78		Мясцовы бюджэт ссуды		121423—04
2. Апал	3018—44		**V. ДОЎГАТЭРМІНОВЫЯ КРЭДЫТЫ:**		
3. Дапаможныя матар'ялы	73497—20	119436—42	1. Белсельбанк	100000—00	
V. Няскончаныя загатоўкі		2451—24	2. Белкамунбанк	62356—30	
VI. Няскончаная вытворчасьць		54616—85	3. Прамфонд	30000—00	192356—30
VII. Паўфабрыкаты		27713—61	**VI. БАНКІ:**		
VIII. Тавары і гатовыя вырабы на складах		69342—76	1. Банкі па спэц. бяг. рах. пад кашт. паперы	6698—46	
IX. ГРАШОВЫЯ СРОДКІ:			2. Банкі па ссудах і абавязац.	54803—72	
1. Каса	4958—40		3. Банкі па вучоту вэксаляў	158671—56	220173—74
2. Бягучыя рахункі	35216—54	40174—94	VII. Вэксалі выданыя		148077—19
X. Каштоўныя паперы		51172—66	**VIII. КРЭДЫТОРЫ:**		
XI. Паі і акцыі		3075—50	1. Рабочыя і служачыя	12943—90	
XII. ВЭКСАЛІ І ДАКУМАНТЫ ДА АТРЫМАНЬНЯ:			2. Пастаўшчыкі і падрадчыкі	57824—23	
1. Вэксалі да атрыманьня	11798—20		3. Пакупцы і заказчыкі	47445—52	
2. „ пратэстованыя	330—86		4. НКФ па падатках і зборах	131542—94	
3. „ у вучоце	158671—56		5. Розныя крэдыторы	76135—20	325891—79
4. Наложаныя плацяжы і дакументы на інкасо	6150—20	176950—82	IX. Прыбыткі будучага году		3341—34
XIII. Пасправаздачныя сумы		2238—93			
XIV. ДЭБІТОРЫ:					
1. Рабочыя і служачыя	13551—37				
2. Пастаўшчыкі і падрадчыкі	94925—87				
3. Пакупцы і заказчыкі	91119—80				
4. Дэбіторы розныя	254359—62				
5. Няпэўныя дэбіторы	26275—50	480232—16			
XV. Выдаткі будучых гадоў		23278—20			
XVI. Страты справаздачнага году		29101—75			
БАЛЯНС		2408697—19	БАЛЯНС	—	2408697—19

ЗА БАЛЯНСАМ.

I. Узаемныя разьлікі Праўленьня з прадпрыёмствамі	614900—26	I. Узаемныя разьлікі Праўленьня з прадпрыёмствамі	614900—26
II. Праўленьне і прадпрыёмства на балянсу	1003522—88	II. Праўленьне і прадпрыёмствы на балянсу	1003522—88
РАЗАМ З БАЛЯНСАМ	1618423—14	РАЗАМ З БАЛЯНСАМ	1618423—14

Дырэктар Камунальнага с.-гасп. прам. Камбінату БУШМАН. **Галоўны бухгальтар СЬВЯРЖЫНСКІ.**

РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ і СТРАТ

ДЭБЕТ **за 1927-28 год** **КРЭДЫТ**

НАЗВА РАХУНКАЎ	СУМА	НАЗВА РАХУНКАЎ	СУМА
1. Перапрацоўка	5000—15	1. Эксплёатацыя	59706—62
2. Жывёлагадоўля	7944—84	2. Рэалізацыя тавараў	41050—76
3. Гандлёвыя выдаткі	22050—34	3. Прыбытак ад пералічэньняў нескарыстанага астатку рэзэрву самніцельных даўгоў	596—04
4. Агульна-адміністрацыйныя выдаткі	56047—38	4. Арэнда	5206—43
5. Процанты	16086—32	5. Страты бягучага году	29101—75
6. Адлічэньні ў рэзэрв самніцельных даўгоў	149—82		
7. Штрафы, пені і няўстойкі заплочаныя	5082—63		
8. Утрыманьне капсэрвіраваных прадпрыёмстваў	883—95		
9. Страты ад прастою	2451—33		
10. Страты ад павальных бед	4338—11		
11. Страты па выбыўшай маемасьці	4693—34		
12. Розныя выдаткі	10963—39		
Балянс.	135691—60	Балянс.	135691—60

Дырэктар камунальнага с.-гасп. прам. камбінату БУШМАН **Галоўны бухгальтар СЬВЯРЖЫНСКІ**

Баляно і рахунак прыбыткаў і страт зацьверджаны сталай камісіі пры Менакрфа (прат. ад 8-V—г. г.) і прэзыдыумам Менакрвыканкому ў пасяджэньні ад 11-12 чэрвеня г. г. і да друку дазволен.

Інспэктар неподат. прыб. Менакрфа КОРБУТ.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ. ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ „ГОРНАЯ БАЛЯДА". Драма ў 7 частках з пралёгам. Пачатак а 7 гадз. 15 хв. Каса а 6 г.

ЗАОЧНОЕ ОБУЧЕНИЕ
ШВЕЙНОМУ ДЕЛУ:
I. Курсы: 1) кройки и шитья; 2) вышивания; 3) головных уборов.
II. Обучение кройке и шитью по плакатам.
III. IV. Курсы пом. инструкт. и кружковод. ЗАКРОЙЩИКОВ.
По окончании—свидетельство.
Справочник 20 к. мелк. марк.
НА КУРСАХ ОБУЧАЮТСЯ 12500 чел.
Москва 9, Тверская, 24.
ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА
„КНІГА--ПОШТАЙ"
Менск, Пляц Волі, 5 тэл. 5-63.
— ВЫСЫЛАЕ —
ЛЮБУЮ КНІГУ
З НАКЛАДНОЙ АПЛАТАЙ.
ПРЫ АТРЫМАНЬНІ ЎСЕЙ СУМЫ
ПЕРАСЫЛКА ДАРМОВА.
ПА ПЕРШАМУ ЗАПАТРАБАВАНЬНЮ ВЫСЫЛАЕЦЦА ДАРМОВА
БЮЛЮТЭНЬ ВЫДАНЬНЯЎ БДВ № 3.
Каталегі высылаюцца дармова.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Картка на кання Тарасіка Д., выд. Чэрвенскім РВК, кв. 813.

— Картка на кання Наборскага І. Д., выд. Чэрвенскім РВК, кв. 813.

— Вучотна-конская кніжка № 322 Мазо Ш., кв. 481п.

Кніжка дапрызыўніка за № 22-3 Будзікава І., выд. Талочынскай прызыўн. камісіяй, кв. 481п.

— Пэнсіён. кніжка за № 4130 Данілава П., выд. Аршанск. вучастковай стракасай, кв. 481п.

— Квіт за № 52274 Пятровіча П. Г., выд. Крупскім страхагенцтвам аб страхаваньні каровы, кв. 481п.

— Пасьвечаньне аб сканчэньні Бабруйскай сямігодкі Гайковіча І. Ф., кв 481п.

— Паявая кніжка Міркіна А., выд. Крупскім спаж. т-вам, кв. № 481п.

— Вучотна-конская кніжка Сакалоўскай А. Д., кв. 481п.

Галоўлітбел 595.

Менск, дзяржаўная друкарня